Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 172 (5846) | 28 ліпеня 1937 г., серада | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЕННЯ У НУМАРЫ:

У ПРЭЗІДЫУМЕ ЦВК СССР. — Уручэнне ордэна Леніна таварышу Н. І. ЕЖОВУ — 1 стар.

АРТЫКУЛЫ:

Перадавы — Да навучальнага года.

Д. Конік — Карэнныя пытанні беларускай кінематаграфіі — 2 стар.

Р. Додзін — У Наркомгасе арудуюць ворагі — 2 стар.

І. Шляфер, А. Лось — Варожая рука ў насентрэсце — 3 стар.

С. Галкін — Двурушніцтва і шкодніцтва — 3 стар.

Н. Вішнеўскі — За пяршынства ў рэспубліцы — 3 стар.

Назначэнне тав. Славуцкага М. М. поўнамоцным прадстаўніком СССР у Японіі.

ЗА РУБЯЖОМ:

На франтах у Іспаніі. На пасяджэнні падкамісіі Лонданскага камітэта.

Громаў, Юмашоў і Данілін на прыёме ў Рузвельта.

ДА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА

Нямнога больш месяца асталося да пачатку новага навучальнага года. Хутка бадзёрая і радасная шматмільённая армія вучняў, адпачнуўшых за лета, з новымі сіламі прыменца за вучобу.

Вялікія і складаныя задачы стаяць перад органамі народнай асветы і школамі рэспублікі ў наступаючым навучальным годзе. Для паспяховага выканання рашэнняў партыі і ўрада аб школе неабходна перш за ўсё самым рашучым чынам ліквідаваць рэшткі шкоднікаў і шкодніцтва ў сістэме народнай асветы БССР. Патрэбна настойлівая барацьба за сістэматычную ачыстку органаў народнай асветы і радоў настаўніцтва ад чужых і выпадковых людзей, патрэбна выключная ўвага да навязлення большэвіцкага парадку ў школе. Зараз адным з адказнейшых участкаў работы ў гэтым напрамку з'яўляецца падрыхтоўка да новага навучальнага года.

Праведзеная ў гэтым месяцы нарада актыва Народнага камісарыята асветы БССР, сігналы з месц, якія паступаюць у «Звязду», сведчаць аб тым, што падрыхтоўка да навучальнага года ідзе яўна нездавальняюча.

Укамплектаванне школ (асабліва сярэдніх) настаўнікамі, выпуск падручнікаў, сшыткаў і наглядных дапаможнікаў, будаўніцтва і рамонт школ ідзе на надзвычайна нізкім узроўні, з яўна школьным разлікам аднесці заканчэнне падрыхтоўкі да апошніх дзён жніўня.

У радзе раёнаў (Даманавіцкі, Бярэзінскі) уся работа па падрыхтоўцы да навучальнага года ўскладзена выключна на раённыя аддзелы народнай асветы, якім райвыканкомы і райкомы КП(б)Б у большасці выпадкаў «дапамагаюць» дырэктывамі і «ўстаноўкамі». Такая практыка прыводзіць да надзвычайна сумных вынікаў.

Былое школьніцкае кіраўніцтва Наркомасветы БССР у асобе фашысцкага наймніта Дзякава і яго прыхвасня Гершона намала напрацавала над тым, каб стварыць вострыя недахопы кадраў настаўнікаў, асабліва для сярэдніх школ і ў першую чаргу па лініі выкладчыкаў мовы і літаратуры.

З дапамогай Цэнтральнага камітэта КП(б)Б новае кіраўніцтва Наркомасветы зараз праводзіць рад мерапрыемстваў па ліквідацыі гэтага школьніцтва. Зусім зразумела, што гэтыя мерапрыемствы паспяхова могуць быць выкананы толькі пры ўмове сур'ёзнай дапамогі Наркамату асветы з боку раённых камітэтаў КП(б)Б і райвыканкомаў.

Выхаванне нашых дзяцей можа быць даручана толькі праверанымі настаўнікам, да канца адданым справе Леніна—Сталіна. Трэба бязлітасна выкарчоўваць з совецкіх школ розную трацкісцка-бухарынскую, нацдэмаўскую і іншую мразь, якая спрабуе сваімі брудными лапамі нанесці шкоду справе комуністычнага выхавання дзяцей нашай цудоўнай радзімы. Сістэматычна ачышчаючы рады настаўніцтва ад чужых і выпадковых людзей, неабходна забяспечыць правільнае скарыстанне ўсіх часных настаўнікаў па сваёй спецыяльнасці. Уважліва камплектуючы кадры педагогаў, трэба рашуча асудзіць, як антыдзяржаўную практыку, спробу асобных райана (як, напрыклад, сенненскага) прадстаўляць «на ўсякі выпадак» перапавялічаныя заяўкі на настаўнікаў для сярэдніх школ.

Выключная ўвага зараз павінна быць звернута на будаўніцтва і рамонт школ. Тут становішча досыць трывожнае. План будаўніцтва новых школ па гарадах выканан дагэтуль толькі на 84 проц. У такіх-жа гарадах як Менск, Мозыр, Жлобін процант выканання плана яшчэ ніжэй. Зусім нездавальняюча ідзе будаўніцтва новых школ па раёнах. У Слуцкім раёне, напрыклад, план будаўніцтва Беліцкай школы выканан толькі на 19,3 проц. Пагла. завезеная на будаўніцтва гэтай школы, са згоды мясцовых арганізацый разбазарана на іншыя будоўлі. Між іншым, органы пракуратуры чамусьці абмінулі мяркаванне гэтае злачыннае дзеянне. У Мозырскім раёне план будаўніцтва Аўцюхоўскай школы выканан толькі на 13 проц., у Журавічах—на 15 проц., а ў Віцебскім раёне будаўніцтва адзінай вясковай школы амаль не распачата.

Будаўніцтва новых школ забяспечана ўсімі матэрыяламі (за выключэннем некаторых жалезных матэрыялаў і круглага лесу, фонды якіх на трэці квартал Дзяржплан БССР дагэтуль яшчэ не паклапаціўся даць). Справа за арганізацыяй чоткай, бесперапыннай работы па ўсіх будоўлях, якія павінны быць скончаны поўнасцю да пачатку навучальнага года. Незмываемую пляму ганьбы, стражайшай адказнасці будуць заслугоўваць кіраўнікі тых раёнаў, у якіх астануцца недабудаванымі новыя школы. План будаўніцтва і рамонту школ павінен быць выканан у тэрмін і высокаякасна!

Выключна важнае значэнне ў падрыхтоўцы да навучальнага года мае выпуск падручнікаў і сшыткаў. Трэба прама сказаць, што такой бясклопатнасці, якая панае ў гэтай справе, цяжка яшчэ дзе знайсці. З 18 падручнікаў для пачатковай школы выдана 12, а з 59 падручнікаў для сярэдняй школы—толькі 8! У пошуках віноўнікаў такога ганебнага становішча з выпускам падручнікаў Дзяржаўнае выдавецтва БССР спасылаецца на Наркомасветы БССР, а апошні—на рэдактараў і аўтараў, і іншыя прычыны. Паміж арганізацыямі, якія павінны займацца выданнем падручнікаў, ідзе ажыўленая паперовая перастрэлка, а на паліцах магазінаў пакуль што падручнікаў зусім мала. Гандаль падручнікамі (асабліва па сетцы Белкаапсаюза) як след не наладжан. У Асіповічах, Гарадку і Лёзне няма ў продажу нават вышэйшых з друку падручнікаў.

План закупкі падручнікаў (2 млн. 700 тыс. экз.) у насельніцтва з-за непаваротлівасці гандлюючых арганізацый правальваецца. План выпуску вучнёўскіх сшыткаў за першае паўгоддзе 1937 года выканан на 90 проц., прычым якасць сшыткаў (іх выпускае «Палесдрук») па-ранейшаму нізкая.

Нездавальняючае становішча з падрыхтоўкай да новага навучальнага года выклікае трывогу. Зусім зразумела, што кіраўнікі апяведных наркаматаў і гандлюючых аб'яднанняў, іх партыйныя арганізацыі павінны неадкладна і ўсебакова заняцца ліквідацыяй ганебных правалаў па важнейшым участку іх работы па падрыхтоўцы к новаму навучальнаму году. Будзе велізарнейшае злачынства, калі з-за бясклопатнасці, якая толькі на-руку ворагу, нашы школы, нашы вучні астануцца незабяспечанымі ўсім неабходным для паспяховай вучобы.

Падрыхтоўка да навучальнага года павінна прыкаваць увагу ўсіх акруговых і раённых арганізацый. Трэба ў самы бліжэйшы час на пашыраных пленумах советаў, на нарадах настаўнікаў, на бацькоўскіх сходах усебакова абмеркаваць і вырашыць усе практычныя пытанні падрыхтоўкі кожнай школы паасобку да пачатку заняткаў. Будаўніцтва, рамонт і абсталяванне школ, забеспячэнне іх апалам, асвятленнем, учот і ахоп навучаннем усіх дзяцей школьнага ўзросту, падрыхтоўка інтэрнатаў і іншыя пытанні не павінны выйсці з-пад увагі мясцовых партыйных і совецкіх арганізацый да поўнага іх вырашэння да пачатку навучальнага года.

Трэба больш рашуча і смела вылучаць на кіруючую работу ў школы, у органы народнай асветы новыя, праверыя кадры, здольныя на справе пад кіраўніцтвам партарганізацый у самы хутчэйшы час ліквідаваць рэшткі шкодніцтва, забяспечыць большэвіцкі парадак у школе, забяспечыць усебаковае выхаванне дастойных патрыётаў нашай сацыялістычнай радзімы.

Узорнай падрыхтоўкай навучальнага года забяспечым канчатковую ліквідацыю другагодніцтва, разгорнем барацьбу за высокую граматнасць і культурнасць совецкага вучня, за паспяховае выкананне рашэнняў партыі і ўрада аб школе!

ГРОМАЎ, ЮМАШОЎ І ДАНІЛІН НА ПРЫЁМЕ Ў РУЗВЕЛЬТА

ВАШЫНГТОН (сталіца ЗША), 26 ліпеня. (БЕЛТА). Сёння совецкія лётчыкі тт. Громаў, Юмашоў і Данілін былі цёпла прыняты прэзідэнтам Рузвельтам. Лётчыкаў суправаджаў у Белы дом (рэзідэнцыя прэзідэнта) паверены ў справах СССР у ЗША тав. Уманскі. У гутарцы з карэспандэнтам ТАСС Герой Совецкага Саюза тав. Громаў паведаміў, што совецкія лётчыкі вельмі ўзрушаны цёплым і дружаскім прыёмам Рузвельта. Рузвельт праявіў вялікую цікавасць да палёту і задаў лётчыкам рад пытанняў аб палёце і самалёце «АНТ-25». Перад гэтым лётчыкі ў суправаджэнні тав. Уманскага наведалі дзяржаўнага сакратара (міністра замежных спраў) Хэла, ваеннага міністра Вутрынга і міністра гандлю Ропера. Лётчыкі мелі доўгую гутарку з радам супрацоўнікаў у бюро камерцыйнай авіяцыі, з якімі абмяркоўвалі пытанні авіяцыі і метэаралогіі. Сёння пасля поўдня совецкія лётчыкі наведаюць начальніка штаба амерыканскай арміі генерала Крэйга і іншых чыноўнікаў ваеннага міністэрства.

НА СТАНЦЫІ „ПАЎНОЧНЫ ПОЛЮС“

Учора, у 7 гадзін вечара, над дрэйфуючай станцыяй «Паўночны полюс» перусіў дождж, стаяў туман. Бачнасць не перавышала 500 метраў. Дуў паўночна-ўсходні вецер сілай у 1 бал. Тэмпература — 0 градусаў.

Каардынаты станцыі былі 88 градусаў 3 мінуты шыраты і 6 градусаў заходняй даўгаты. (БЕЛТА).

У ДЫПЛАМАТЫЧНЫМ СВЕЦЕ

Выехаў з Масквы надзвычайны і поўнамоцны пасол Кітайскай рэспублікі ў СССР п. Цзян Тын-фу, пакінуўшы на час сваёй адсутнасці п. Шы Чжао-іп. (БЕЛТА).

У Прэзідыуме ЦВК СССР

УРУЧЭННЕ ОРДЭНА ЛЕНІНА таварышу Н. І. ЕЖОВУ

27 ліпеня пад старшынствам тав. М. І. Калініна адбылося пасяджэнне Прэзідыума ЦВК СССР, на якім былі ўручаны ордэны ўзнагароджаным таварышам.

Сакратар ЦВК СССР тав. Горкін першым агалашае імя народнага камісара ўнутраных спраў генеральнага камісара дзяржаўнай бяспечнасці Нікалая Іванавіча Ежова. Пастановай ЦВК Саюза ён узнагароджан ордэнам Леніна за выдатнейшыя поспехі ў справе кіраўніцтва органамі Наркамата ўнутраных спраў па выкананню ўрадавых заданняў. Усе сабраўшыяся, стоячы, цёпла вітаюць баявога наркома, саратніка таварыша Сталіна, адданейшага сына большэвіцкай партыі. У яго асобе яны вітаюць слаўных работнікаў Народнага камісарыята ўнутраных спраў, якія пільна стаяць на варце заваяванняў сацыялізма і бязлітасна выкарчоўваюць трацкісцка-бухарынскіх і іншых агентаў фашызма — шпіёнаў, дыверсантаў, шкоднікаў. У зале грымяць бурныя апладысменты, воклічы «ура». Міхаіл Іванавіч, уручаючы ордэн Леніна тав. Ежову, абнімае яго.

Таварыш Ежоў звяртаецца да Прэзідыума ЦВК СССР з прамовай.

Затым атрымліваюць ордэны тт. Фрынаўскі, Бельскі, Рэдэнс, Дагін, Закоўскі і іншыя работнікі Наркамата ўнутраных спраў, узнагароджаныя за ўзорнае і самаадданае выкананне важнейшых заданняў урада. Зноў і зноў у зале раздаюцца апладысменты.

Узнагароды ўручаюцца таксама будаўнікам канала Масква—Волга. Сярод іх—начальнік будаўніцтва канала тав. Берман, галоўны інжынер тав. Жук, начальнікі раёнаў, інжынеры, супрацоўнікі будаўніцтва.

Камбрыгу Хальзунову ўручаюцца грамата аб прысваенні яму звання Героя Совецкага Саюза і Ордэн Леніна. Апрача таго ўзнагароды атрымлівае рад камандзіраў Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Узнагароджаны за доблесць і геройства, праяўленыя пры абароне дзяржаўных граніц, чырвонаармеец С. Е. Фадзееў атрымлівае ордэн Чырвонага Сцяга.

Уручыўшы ордэны, тав. М. І. Калінін выступае з прамовай. (БЕЛТА).

АБ НАЗНАЧЭННІ тав. СЛАВУЦКАГА М. М. ПОЎНАМОЦНЫМ ПРАДСТАЎНІКОМ СССР У ЯПОНІІ

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА СССР

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР **пастанаўляе:**

Назначыць тав. **Славуцкага** Міхаіла Міхайлавіча поўнамоцным прадстаўніком СССР у Японіі.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
27 ліпеня 1937 г.

***

Славуцкі Міхаіл Міхайлавіч нарадзіўся ў 1898 годзе ў горадзе Крэменчугу. Вучыўся ў Політэхнічным інстытуце. У 1919—1920 г.—першы сакратар поўнамоцнага прадстаўніцтва РСФСР у Бухары. У 1920—1921 г.—віцэ-консул, а затым в. аб. генеральнага консула ў Герацe (Афганістан). У 1921—1923 г.—рэферэнт і памочнік загадчыка аддзелам Бліжняга Ўсходу НКЗС. У 1923—1924 г. г.—генеральны консул ў Таўрызе (Іран). З 1924 па 1927 г.—першы сакратар паўпрэдства і паверены ў справах СССР у Іране. 1928—1929 г.—памочнік загадчыка аддзелам Сярэдняга Ўсходу НКЗС. 1930—1931 гг.—упаўнаважаны НКЗС у Ташкенце. З 1931 года—генеральны консул СССР у Харбіне.

МАТОР НЕ ПАДВЁЎ НАС НІ РАЗУ

Калектыву завода імя Фрунзе

Дарагія таварышы!

Вярнуўшыся ў родную сталіцу пасля выканання сталінскага задання, мы выказваем шчырую падзяку вам, слаўнаму калектыву завода імя Фрунзе, даўшаму матор для «АНТ-25».

У пяжкія гадзіны сляпога палёту, у часе палёту над суровымі прасторамі Арктыкі і Скалістымі горамі мы верылі сэрцу нашага самалёта. І матор маркі вашага завода не падвёў нас ні разу.

Вы слаўна папрацавалі над тым, каб забяспечыць чоткае выкананне задання вялікага Сталіна. У нашым пералёце ёсць вялікая доля вашай працы, як і працы ўсяго шматмільённага народу нашай краіны.

Мы ўпэўнены ў тым, што калектыў Фрунзенцаў не спыніцца на дасягнутым, а пойдзе наперад, ствараючы першакласныя маторы, на якіх лётчыкі нашай краіны зробяць дзесяткі і сотні пералётаў па сталінскіх заданнях.

Моцна паціскаем вашы рукі.

Прывітанне ўсяму калектыву Фрунзенцаў!

Ад імя экіпажа «АНТ-25»
Герой Совецкага Саюза В. ЧКАЛАЎ.
Масква, 26 ліпеня 1937 г.

ВЯЛІКІ ЎРАДЖАЙ У АЗОВА-ЧОРНАМОР'І

КРАСНАДАР, 27 ліпеня. (БЕЛТА). У многіх раёнах Азова-Чорнамор'я ўборка хлябоў блізіцца к канцу. Учора кончылі касавіцу каласавых Славянскі, Грэчаскі і Мар'янскі раёны. Сёння дакошваюць апошнія гектары Іванаўскі, Цімашэўскі і рад іншых раёнаў. Тут паўсямесна ўраджай зернавых вылатны—па 19 і звыш пэнтнераў з гектара. Калгасы Цімашэўскага раёна ў сярэднім намалочваюць па 24 цэнтнеры з га.

Тав. Афанасенка Дзмітрый — знатны ільнацерабільшчык Будакашалеўскай МТС, які выцерабіў за змену звыш 15 гектараў ільну. Фото С. Грына.

КАМБАЙНЕР ЗАБРАНСКІ ЎБРАЎ ЗА ДЗЕНЬ 23,1 га ЖЫТА

Камбайнер Каспюковіцкай МТС т. Забранскі І. Г., які працуе на ўборцы ўраджаю ў сельгасарцелі «Чырвоны ўдарнік», Нізькаўскага сельсовета, 20 ліпеня на паўднёвым камбайне «Комунар» убраў за дзень 23,1 гектара жыта пры норме 8 гектараў.

Тав. Забранскі абавязаўся давесці штодзённую выпрацоўку на камбайн да 30 гектараў і ўбраць за сезон 500 гектараў замест нормы 180 гектараў.

С. ІСАЧАНКА.

Камбайнер Еўсейчык выканаў сезонную норму

Камбайнер Старобінскай МТС Еўсейчык штодзённа ўбірае паўночным камбайнам па 8—12 гектараў пры норме 4 гектары. Еўсейчык ужо ўбраў камбайнам 80 гектараў, выканаўшы сезонную норму.

Камбайнер Гапановіч убраў паўночным камбайнам 70 гектараў, Лойка — 65 гектараў. (БЕЛТА).

ЗВЕННЯВАЯ ІВАНОВА РАЗАСЛАЛА ЛЁН

У калгасе імя Варашылава, Нікіцінскага сельсовета (Шклоўскі раён), звяно Іванова скончыла церабленне і абмалот ільну. Ураджай ільну добры. Звяно дабіваецца ўзяць 11 цэнтнераў валакна з гектара.

Звеннявая Іванова ўжо скончыла расцілаць лён. **І. Ш.**

ЗДАЮЦЬ ІЛЬНОНАСЕННЕ

Калгасы Шклоўскага сельсовета прыступілі да злачы дзяржаве па кантрактацыйных дагаворах ільнонасення новага ўраджаю. Калгас «Молот» здаў 402 кілограмы, «Чырвоны шлях» — 641 кілограм. (БЕЛТА).

КАЛГАСНІКІ АТРЫМЛІВАЮЦЬ АВАНСЫ

Першымі ў Бабруйскім раёне закончылі ўборку азімых калгаснікі арцелі «Ленінскі шлях», Каменскага сельсовета. Асаблівы прыклад барацьбы за паспяховую ўборку паказалі калгаснікі. Яны ўсе, як адна, штодзённа выжынялі па 0,25—0,30 гектара. Лепшая стаханаўка калгаса Антаніна Трапэўская выжынала па 0,40 гектара (норма—0,12 га). Адначасова з уборкай калгаснікі арганізавалі малацьбу і здачу зярна дзяржаве.

25 ліпеня калгаснікі адвезлі на дзяржаўныя склады апошнія кілограмы збожжа па абавязковых пастаўках дзяржаве. Усяго здана 45 цнт. Скончан абмалот азімых культур і засыпаны насенфонды.

Разлічыўшыся з дзяржавай, калгас прыступіў да выдачы азансаў на працадні калгаснікам. Першая выдача аванса калгаснікам вызначана праўленнем па 500 грамаў на кожны працадзень.

Лепшы стаханавец калгаса Трапэўскі Пабіян, які за 6 месяцаў выпрацаваў разам з сям'ёй 683 працадні, першым атрымаў 22 пуды зярна. Па самых скромных падліках калгаснікі мяркуюць у гэтым годзе атрымаць на працадзень 3 кіло зярна і 12 кіло бульбы. **ПАТАПЕЙКА.**

Плады бясклопатнасці Кіраўскага райкома

Калгасы Кіраўскага раёна знімаюць са сваіх палёў высокі ўраджай зернавых культур. Азімае жыта і ячмень у многіх калгасах пры першых абмалотах даюць звыш 15 пэнтнераў з гектара. Калгаснікі ведаюць, што будзе на працадзень па 3—4 кілограмы хлеба. Багаты ўраджай і вялікая дапамога, што аказана калгасам совецкай дзяржавай, падымаюць палітычную актыўнасць калгасных мас, якія гатовы з небывалым энтузіязмам змагацца каб убраць ураджай без страт, выпэй палняць кошт працадня і гэтым самым ліквідаваць вынікі шкодніцтва, якое праводзілася ворагамі народу, пралезшымі і на кіруючыя пасты ў раёне.

Ворагі народу — былы сакратар РК КП(б)Б Вільчак, Фельман і іншыя паспелі нямала нашкодзіць у раёне. Сляды іх шкодніцтва даюць адчуваць сябе яшчэ зараз, у ходзе ўборкі ўраджаю. Асабліва гэта адчуваецца ў калгасах, больш закранутых шкодніцкай дзейнасцю.

У калгасе «Другая пяцігодка», Капусцінніцкага сельсовета, шкоднік Аўсянікаў, які пралез у праўленне арцелі і працаваў брыгадзірам, свядома не запісваў калгаснікам ні аднаго працадня, ажыццяўляў кулацкую ўраўнілаўку. Гэта адбілася на дысцыпліне ў калгасе, якая за апошні час зусім аслабла.

Як вынік гэтага, уборка тут недапушчальна зацягнулася. За 12 дзён жата толькі 45 гектараў. Жыта прастойвае і асыпаецца. Да жніва ячменю і пшаніцы зусім не прыступілі. Жняркі пушчаны на поле няспраўнымі, прыносяць велізарную страту збожжа. Калгас гублае пры такой уборцы многа хлеба, зніжае свой ураджай.

У калгасе «XVII партз'езд», Паўлавіцкага сельсовета, брыгадзір 1-й брыгады Шмыгун Нікалай тэорыць яўна антысовецкія справы—збівае калгаснік, направільна налічае ім працадні. Робіцца гэта з мэтай, каб калгаснікі не выходзілі на работу. У брыгадзе ўборка пастаўлена пад пагрозу. На полі ляжыць не звязанага 21 гектар жыта, а нямала з плошчы аднаго гектара прарос у пракосах. Многа збожжа асыпаецца на корані.

Ёсць факты праследвання ў калгасах лепшых людзей — стаханаўцаў, якія імкнуцца хутчэй убраць ураджай.

Так, напрыклад, у калгасе імя Гікало, Любоніцкага сельсовета, лепшай стаханаўцы Жалакозіч, якая выжынае за дзень на 0,42 гектара, пры норме 0,12 гектара, на кожным кроку перашкаджаюць у рабоце. Праўленне калгаса і старшыня Лазаковіч не абаранілі лепшую жняю ад праследвання. Больш таго, Лазаковіч знімае Жалакозіч з аднаго ўчастка і перакідае на другі, каб яна не выконвала нормы. Можна прывесці многа зыпадкаў бязлітасных адносін да лепшых людзей калгасаў — стаханаўцаў сацыялістычных палёў.

Не дзіўна пасля гэтага, што стаханаўскі рух у раёне не разгорнут. У брыгадах і калгасах на ўборцы зусім адсутнічае сацыялістычнае спаборніцтва, ні ў адным калгасе няма звенняў. Работа ў большасці праходзіць скопам, у асобных калгасах ігнаруецца індывідуальная здзельшчына. Сілы на ўборцы расстаўлены дрэнна.

За 8—10 дзён у калгасах жата толькі трэцяя частка плошчы зернавых. Урадавыя тэрміны — убрать зернавыя за 10—12 дзён—не выконваюцца. Уборка расцягваецца амаль на месяц.

Страты ўраджаю велізарныя. Яны дапускаюцца на ўсіх працэсах уборкі. Асабліва вялікі разрыў паміж жнівом і звозкай або спіртаваннем хлеба. З агульнай колькасці зжатых зернавых на плошчы 7.097 гектараў заспіртавана або звезена толькі 558 гектараў. Астатні ўраджай ляжыць пад дажджом, мясцамі прарастае і нізае не ахоўваецца.

Малацьба ў раёне зрываецца. Большасць малатарань няспраўныя і прастойваюць у калгасах. Зараз высвятляецца, што тут не абышлося без шкодніцтва. Рамонтам сельгасмашын кіраваў механік МТС Баленкоў — сын кулака, раней асуджаны за шкодніцтва. Карыстаючыся палітычнай бясклопатнасцю дырэктара МТС Путырскага, ён вывеў са строю ўсе малатарні. Не лепшае становішча з іншымі ўборачнымі машынамі, якія выпушчаны на поле няспраўнымі. А дырэктар МТС Путырскі і яго памочнік па палітчасці Наумава замест таго, каб узяцца за разблытванне ўсіх ніцей шкодніцтва і ліквідацыю яго вынікаў, вядуць паміж сабой бяспрынцыпную склоку.

На пасадзе загатчыка райзямаддзела знаходзіцца Дамброўскі, які працуе ў раёне доўгі час і не можа не ведаць пра многія справы ворагаў народу, слязеўшых у кіраўніцтве раёна. Замест рашучай барацьбы за хутчэйшую ліквідацыю вынікаў шкодніцтва, ён адсяджваецца, не прымае мер, каб да канца выкрыць шкодніцтва ў сельскай гаспадарцы раёна і ў самім райзямаддзеле. Гэтымі днямі апарат райзямаддзела разаслаў у калгасы шкодніцкую інструкцыю па пытаннях агратэхнікі, падпісаную шпіёнам, дыверсантам Бенекам. Вядома таксама, што Дамброўскі неаднаразова штампаваў шкодніцкія зводкі, пакрываў шкодніка ветурача Шаруніча і яму падобных.

Выконваючы абавязкі старшыні РВК Лапінскі таксама вядзе сябе падобна Дамброўскаму. А вядома-ж, што Лапінскі быў прыяцелем Вільчака. Не мог ён не ведаць і аб справах былога старшыні РВК Блюмкіна.

Аднак, не гледзячы на ўсё гэта, райком КП(б)Б не высветліў яшчэ да канца палітычнага твару Лапінскага і Дамброўскага, не прадпрыняў усіх мер, каб поўнасцю выкараніць рэшты шкодніцтва ў раёне.

А. ЛЯСНЫ.

У НАРКАМГАСЕ АРУДУЮЦЬ ВОРАГІ

Вялікія сродкі на комунальнае і жыллёвае будаўніцтва, на мерапрыемствы па паляпшэнню бытавых умоў і абслугоўванне працоўных вылучае наш урад. Комунальная гаспадарка пры гэтых сродках, калі-б яны правільна скарыстоўваліся, магла моцна ўзрасці. Але ў БССР яна да гэтага часу знаходзіцца ў запушчаным становішчы.

У чым прычына? Яна ляжыць у той шкодніцкай рабоце, якая ў комунальнай гаспадарцы прыняла шырокія размеры.

Асаблівай увагай подлай банды шкоднікаў карысталася жыллёвая гаспадарка. Разбураючы стары жыллёвы фонд і затрымліваючы будаўніцтва новых жылых дамоў, гэта банда стварала вялікі жыллёвы недахват.

У першым паўгоддзі 1937 года наркамату было адпушчана на комунально-жыллёвае будаўніцтва 9.880 тыс. рублёў, а скарыстана менш паловы, каля 4 млн. рублёў. 72-кватэрны дом і 10 стандартных дамоў у Менску, тры 8-кватэрных дамы ў Гомелі, 24-кватэрны дом у Рэчыцы, 12-кватэрныя дамы ў Слуцку і Мозыры, пральні ў Слуцку і Магілеве не скончаны будаўніцтвам, хаця тэрмін работ ужо прайшоў.

Да гэтага часу не прыступілі да будаўніцтва электрастанцый у Заслаўлі, Лепелі і Ельску, па плану-ж яны павінны быць у гэтым годзе скончаны.

У сістэме Наркомгаса беспакарана арудуюць шкоднікі. Аднак, тут самыя абураючыя шкодніцкія акты старанна ўтойваюць, кваліфікуюць іх, як простыя «памылкі» або «недахопы».

У 1936 годзе прыступілі да рэканструкцыі менскага водаправода па праекту інжынера Іосіна. Але, як потым аказалася, праект яўна шкодніцкі. Яго ажыццяўленне палегчыла-б ворагам нашай радзімы ў любы час пазбавіць сталіцу вады. Аднак, гэты абураючы факт у наркамаце расцанілі толькі, як простую «памылку» аўтара праекта.

Слупкую ДЭС праектавалі дзве арганізацыі — Белдзяржпраект і Цеплаэнергамантаж. Абедзве арганізацыі нямала пашкодзілі. Расплата пачалася ўжо зараз: адбылася асадка фундаментаў пад катламі, паўтараюцца шматлікія аварыі і паломкі абсталявання. Але ў наркамаце гэта называюць «тэхнічнымі недахопамі» і да адказнасці нікога не прыцягваюць.

Менскую цеплаэлектрацэнтраль таксама праектавалі па-шкодніцку. У выпадку аварыі станцыя можа быць затоплена валой. Між цэнтральным размеркавальным калодзежам і кацельнай праведзена толькі адна магістраль. Такім чынам, пры малейшай аварыі ўся станцыя выключаецца.

Па-шкодніцку праектаваліся і будуюцца лазні. Асаблівую ўвагу шкоднікі накіравалі на зрыў будаўніцтва лазняў у прыгранічных раёнах. У рэзультаце ў Мозыры, напрыклад, будуюць лазню з 1932 г. і да гэтага часу ніяк не пабудуюць. 3-ці год будуецца лазня ў Менску.

Шматлікія шкодніцкія акты на электрастанцыях, у менскім трамварку таксама астаюцца без рэагавання наркамата.

Прычыны гэтага стануць ясныя, калі больш сур'ёзна прыгледзецца да людзей, якія ўзначальваюць наркамат, да палітычнага твару яго кіраўнікоў.

Васэрман — стаўленік Галадзеда. У мінулым — бундавец і анархіст. У гады грамадзянскай вайны сваю «баявую» дзейнасць ён галоўным чынам праводзіць у акалодках. У 1923 годзе, маючы партбілет у кішэні, Васэрман арганізуе... забастоўку арцелі будаўнікоў супроць совецкай улады. Уся біяграфія і практыка Васэрмана паказвае, што ён па сутнасці захаваў у сабе ўсе рысы характара, уласцівыя людзям, якія былі ў небольшэвіцкіх арганізацыях.

Прабраўшыся ў наркамат, Васэрман імкнецца выжываць комуністаў і комсамольцаў з апарата наркамата, падбірае людзей, яўна варожых совецкай уладзе, выгнаных з іншых устаноў за антысовецкую работу, выключаных з партыі за палітычныя праступкі.

Першым намеснікам Васэрмана быў Амбражунас, прайшоўшы «школу» Галадзеда і зараз выкрыты, як вораг народу.

Сваім другім намеснікам Васэрман узяў Царонка, таксама прышоўшага з «школы» Галадзеда (арбітр Соўнаркома), у мінулым актыўнага удзельніка контррэвалюцыйнай эсэраўскай арганізацыі. Царонак па нейкіх незразумелых прычынах не служыў у Чырвонай Арміі і ўхіліўся ад партыйнай мабілізацыі на фронт у часе грамадзянскай вайны. За ўвесь час свайго прабывання ў нашай партыі Царонак «не спраўляўся» ні з адной работай, якая яму даручалася. У Белкаапсаюзе Царонак «пераладверыў» усю работу свайму намесніку Вярбе, з якім быў у цеснай дружбе. Вярба аказаўся шпіёнам, прысланым адной замежнай дзяржавай са спецыяльнымі шпіёнскімі заданнямі. Царонак разам з гэтым заклятым ворагам народу правальваў справу забеспячэння прапоўных прадметамі першай неабходнасці.

Кіраўніком Жыляемкіраўніцтва наркамата Васэрман паставіў выключанага з партыі старога штабс-капітана Збыжка, які ў часе нямецкай акупацыі трапіў у палон, але «дабрадушнымі» акупантамі быў нейкім чынам адпушчан на радзіму на Каўказ. Збыжка да гэтага працаваў інжынерам па планіраўцы гарадоў і правяў справу. Аднак, гэта не перашкодзіла Васэрману вылучыць яго начальнікам кіраўніцтва. Характэрна, што гэты самы Збыжка да моманту выкрыцця здрадніка радзімы агентаў замежнай контрразведкі — Убарэвіча і Эйлэмана, пахваляўся, што асабіста знаём з імі.

Начальнікам энергакіраўніцтва да апошняга часу быў нейкі Дэніс, запрошаны на работу асабіста Амбражунасам. Пад кіраўніцтвам Дэніса зрываліся планы будаўніцтва электрастанцый, беспакарана адбываліся шкодніцкія акты. Булучы парторгам у Энергаінстытуце, Дэніс пакрываў актыўную трацкістку Аўян. Дэніс быў носьбітам «тэорыі» аб нерэальнасці плана электрыфікацыі.

Па незразумелых прычынах кантраляваць Белдзяржпраект, дзе шкоднікі звілі сабе моцнае гняздо, Васэрман вылучыў чалавека, не маючага ніякай тэхнічнай адукацыі.

Начальнікам аддзела капітальнага будаўніцтва Васэрман прыняў свайго прыяцеля Кліонскага, які штампуе шкодніцкія праекты і каштарысы, «не заўважае» падрыўной работы ворагаў.

З Наркаммясцпромаў выгналі за антысовецкія выступленні нейкага Яноўскага, а Васэрман ахвотна яго прыняў загадчыкам бюро навукова-тэхнічнай кансультацыі.

З Водаканалтрэста звольнілі двойчы выключанага з партыі антысовецка настроенага інжынера Звярко, але Васэрман і яму прадаставіў работу на адказным аб'екце (Свіслачбуд) у якасці інжынера.

Былы галоўны інжынер энергакіраўніцтва Дутлаў, выключаны з партыі як сын жандара, нямала папрацаваўшы разам з Дэнісам па падрыў работы па электрыфікацыі БССР, паслан Васэрманам галоўным інжынерам менскай сеці і падстанцый.

Ці не абавязваюць справы наркамата і такое згрупаванне людзей, па меншай меры неправераных, больш уважліва прыгледзецца да Наркомгаса і асабіста Васэрмана?

Р. ДОДЗІН.

Пазыка ўмацавання абароны Саюза ССР

ПА БССР РЭАЛІЗАВАНА ПАЗЫКІ НА 98.884 тыс. руб.

Па даных Кіраўніцтва ашчадкас БССР на 26 ліпеня 1937 г. па распубліцы рэалізавана пазыкі ўмацавання абароны Саюза ССР на 98.884 тысячы рублёў. Па раду раёнаў падпіска перавысіла ўжо суму падпіскі на пазыку ў мінулым годзе. У цэлым па распубліцы па групе рабочых і служачых падпіска на новую пазыку перавысіла падпіску на пазыку другой пяцігодкі (выпуску чацвертага года) на 26 ліпеня 1936 г. на 2.236 тысяч рублёў.

ХРОНІКА ПАЗЫКІ

МЕНСК

Прапоўныя сталіцы БССР і Менскага раёна дэманструюць свае пачуцці гарачага совецкага патрыятызма падпіскай на пазыку ўмацавання абароны Саюза ССР. На 26 ліпеня мінулага года пазыка другой пяцігодкі (выпуску чацвертага года) была рэалізавана на 15.631 тысячу рублёў, а на 26 ліпеня бягучага года сума падпіскі на новую пазыку дасягнула ўжо 16.265 тысяч рублёў. Такім чынам мінулагодняя падпіска перавышана на 634 тысячы рублёў.

МАГІЛЕЎ

На 26 ліпеня сума рэалізацыі пазыкі ўмацавання абароны Саюза ССР па гораду Магілеву і раёну склала 108,7 проц. да падпіскі на пазыку другой пяцігодкі (выпуску чацвертага года). Падпіска прадаўжаецца.

СМІЛАВІЧЫ

Падпіска ў Смілавіцкім раёне на 26 ліпеня перавысіла на 45 тысяч рублёў падпіску на пазыку мінулага года.

ГОМЕЛЬ

Прапоўныя Гомельшчыны з велізарным энтузіязмам падпісваюцца на новую пазыку. На 26 ліпеня падпіска па гораду і раёну дасягнула 9.625 тысяч рублёў, што перавышае мінулагоднюю падпіску на гэты час на 438 тысяч рублёў.

ОРША

Пазыка ўмацавання абароны Саюза ССР размешчана па Аршанскаму раёну на 26 ліпеня на 4.586 тысяч рублёў з перавышэннем падпіскі на мінулую пазыку на гэты дзень на 144 тысячы рублёў.

МОЗЫР

У Мозырскім раёне сума падпіскі на новую пазыку дасягнула да 26 ліпеня 1.920 тысяч рублёў, перавысіўшы падпіску на мінулую пазыку на 107,9 проц.

БАБРУЙСК

У Бабруйскім раёне сума падпіскі на пазыку на 26 ліпеня дасягнула 4.085 тысяч рублёў, перавысіўшы на 37 тысяч рублёў падпіску 1936 года.

НАСУСТРАЧ МІЖНАРОДНАМУ АНТЫВАЕННАМУ ДНЮ

⊙ Менскі Дом Чырвонай Арміі імя Варашылава наладжвае два масавых вечары, прысвечаных антываеннаму дню. У праграме вечароў — гутаркі аб Міжнародным антываенным дні, аб інтрыгах фашысцкіх падпальшчыкаў вайны на Захадзе і Ўсходзе, аб грамадзянскай вайне ў Іспаніі і т. д. Будуць таксама арганізаваны масавыя кіносеансы.

⊙ 27, 28 і 29 ліпеня менскі Дом Чырвонай Арміі імя Варашылава праводзіць гарнізонныя стралковыя спаборніцтвы жонак камандзіра і начальніцкага састава, прысвечаныя Міжнароднаму антываеннаму дню. У спаборніцтвах прымаюць удзел 18 каманд з 100 жанчын-стралкоў. Стрэльбы будуць праводзіцца з дробнакаліберных вінтовак на дыстанцыі ў 50 метраў. Дэманстрацыі спаборніцтваў атрымаюць каштоўныя падарункі.

⊙ У адзнаку Міжнароднага антываеннага дня — 1 жніўня—басейнавы камітэт Дняпрадзвінскага параходства і Белоазёр праводзяць ваенізаваны шлюпачны паход па маршруту Гомель—Лоеў, працягласцю 114 кілометраў. У паходзе прымуць удзел тры каманды, з іх адна жаночая.



Дом адпачынку «Ждановічы». НА ЗДЫМКУ: адзін з лепшых карпусоў, адведзены, згодна пастановы ВЦСПС, пад дом адпачынку цяжарных жанчын.

Фото П. Шышко (БСФ).

ЗА ШЫЛЬДАЙ СЯМЕЙНАСЦІ

Дырэктарам Крычаўскага педвучылішча фармальна лічыцца член партыі Шумілаў. Але ўсю работу ён пераладверыў свайму намесніку па вучэбнай часці Шлегу. Сам Шумілаў у вучылішчы бывае рэдка, большую частку навучальнага года ён знаходзіцца ў невядомых камандыроўках або на будаўніцтве педвучылішча, якое, да-рэчы, за 5 месяцаў яшчэ не распачата. Словам, усёй работай кіруе Шлег. Але што гэта за кіраўніцтва, відаць з наступных фактаў.

Як загадчык вучэбнай часці, Шлег амаль штодзень на працягу года зменяў расклады, змяншаючы і павялічваючы тыднёвую нагрузку выкладчыкаў, уносячы блытаніну ў вучэбныя планы. Каб затрудніць праверку выканання планаў і праграм, а таксама ўлік гадзін, класныя журналы за большую частку гэтага года знішчаны, а ў новых журналах устаноўлен такі ўлік гадзін, які не дае магчымасці кантраляваць выкананне праграмы.

Шлег згрупаваў вакол сябе цёплую сямейку сваіх падхалімаў. Стэльмаховіч — дачка памешчыка, жонка былога буйнага царскага чыноўніка, дзякуючы клопатам Шлега, мае нагрузку больш 10 гадзін у суткі. Яе сын — аграном, які не мае ні педагагічнай адукацыі, ні практыкі, таксама прытулен Шлегам. Выкладчыкі масаматыкі супругі Каралёвы ўсяк дагаджаюць Шумілаву і Шлегу. На кожным кроку імкнуцца кампраметаваць тых, хто не хоча мірыцца з такім становішчам.

За спробу крытыкаваць дырэкцыю ў насценгазеце за безгаспадарчасць, абязлічку і разгільдзяйства Шлег увесь час пагражаў рэдактару насцентазеты Якубенку, і адночы сам, без ведама рэдактара, сарваў змешчаную карыкатуру. Шумілаў і ў гэтым факце самага грубага зацiску крытыкі падтрымлівае Шлега.

Нядаўна на мясцкоме разглядалася справа настаўніка Кажанава, які з'яўляўся п'яным на заняткі. Высветлілася, што Шлег забяспечваў Кажанава спіртам з хімкабінета і потым утрох, разам з Шумілавым, п'янствавалі. Шумілаў ад Кажанава атрымаў у якасці ўзяткі сем пудоў бульбы і за гэта пакрываў п'яніну Кажанава.

Доўгі час Шумілаў быў звязан з выкрытым трацкістам Хапяноўскім, і гэта сувязь не магла не адбіцца на пазнейшых паводзінах Шумілава. Нават на студэнцкім схоздзе, калі студэнты віталі прыгакім схозе, калі студэнты віталі прыгакім схозе, калі студэнты віталі прыгакім схоз

ДВУРУШНІЦТВА І ШКОДНІЦТВА

У канцы 1936 года наркамат аховы здароўя БССР прадставіў вышэйшым органам весткі, што план будаўніцтва радзільных дамоў і дзіцячых ясляў выкананы па БССР на 88 проц.

Гэта была яўна хлуслівая, ашуканчая лічба. Яна была сфабрыкавана проста: даныя па аб'ёму фінансавання Наркамат аховы здароўя выдаў за даныя па выкананню плана па аб'ёму работ, якое складала ўсяго 65—70 проц.

Для чаго патрэбна было кіраўнікам наркамата такая жульніцкая махінацыя? Для таго, каб сарваць будаўніцтва 1937 года! У адпаведнасці з прадстаўленымі весткамі, НКАховы здароўя СССР адпусціў сродкі на скончэнне будаўніцтва, выходзячы з астаўшыхся 12 проц., а не 30—35 проц., кіраўнікі-ж рэспубліканскага наркамата цяпер сцвярджаюць, што будаўніцтва зрываецца з-за адсутнасці сродкаў.

Стаўка на зрыў будаўніцтва стане яснай, калі прааналізаваць становішча з капітальным будаўніцтвам па сістэме НКАховы здароўя на працягу ряду год. У 1933 годзе з асігнаваных урадам для гэтай мэты сродкаў асталіся неасвоенымі 1.520 тыс. руб., у 1934 годзе — 1.560 тыс. руб., не выкарыстаны поўнасцю сродкі і ў 1935 годзе.

Гэты сістэматычны зрыў капітальнага будаўніцтва не выпадковы. У апараце НКАховы здароўя доўгі час арудвалі подлыя ворагі народу Олікер, Селівестраў і інш. Яны прыкладалі ўсе сілы, каб штучна затрымаць развіццё справы аховы здароўя ў БССР, каб праваліць важнейшыя мерапрыемствы партыі і ўрада.

Цяперашняя практыка НКАховы здароўя БССР ярка сведчыць, што парасткі, пушчаныя гэтымі гнуснымі бандытамі і шкоднікамі, не выкаранены яшчэ і да гэтага часу. У прыватнасці, не ліквідавана шкодніцкая практыка планавання і вядзення капітальнага будаўніцтва.

Начальнікам планава-фінансавага аддзела наркамата да апошніх дзён працаваў нейкі Пархоменка, які служыў у свой час у міліцыі Керэнскага. Пархоменка і яго намеснік Гіткін (які працуе і зараз) разам з інжынерам Скуратовічам і пры поўным патрыманні Бурачаўскага і яго былога намесніка Нейштата настойліва праводзілі ў жыццё сваю шкодніцкую «тэорыю» аб немагчымасці закончыць будаўніцтва радзільных дамоў і ясляў на працягу аднаго года. Яны ўсяляк стараліся зацягнуць будаўніцтва па некалькі год. У рэзультаце рад аб'ектаў, пачатых у 1932—33 годзе, яшчэ не скончан.

У 1936 годзе асталіся нескончанымі 23 аб'екты будаўніцтва, у тым ліку такія, якія маюць абаронае значэнне. Здавалася-б, першачарговай задачай з'яўляецца скончэнне гэтага пераходзячага будаўніцтва. Аднак, у Наркомаховы здароўя зрабілі інакш. Многія з гэтых аб'ектаў закансервавалі, не ўключылі ў план 1937 года. Закансервавалі, напрыклад, будаўніцтва больніцы ва Ушачах, інфекцыйныя корпусы ў Чырвонай Слабадзе, Грэску, Чашніках, рад санітарных прапускнікоў і т. д. Агульная сума незакончанага будаўніцтва складае каля мільёна рублёў.

У той-жа час работнікі Наркомаховы здароўя, робячы выгляд, што яны змагаюцца за паляпшэнне аховы здароўя, запапярэнне тэхнічнай базы аховы здароўя ў БССР, патрабавалі новых сродкаў у дзяржавы, складаючы лутыя і шкодніцкія праекты і каштарысы на новае будаўніцтва. На 1938 год Наркомаховы здароўя запраектаваў затраты на капітальнае будаўніцтва ў суме 113 мільёнаў рублёў. У самім наркамаце добра ўсведамляюць, што гэта лічба перапавялічана ў некалькі разоў. Даволі сказаць, што на 1937 год асігнавана 20 мільёнаў рублёў і што з 19,5 мільёна рублёў, адпушчаных у 1936 г., асталіся неасвоенымі звыш 7 мільёнаў руб.

У планы ўключаліся яўна шкодніцкія аб'екты будаўніцтва. Так, у Гомелі было пачата будаўніцтва рабочай больніцы, для якой белагвардзеец Браўковіч (былы старшыня горсовета) адвёў такі ўчастак, куды немагчыма было-б нават падвезці хворага. Не гледзячы на заключэнне спецыяльнай камісіі аб недапушчальнасці працягвання гэтага будаўніцтва, Наркомаховы здароўя ўсё-ж настаяў на ўключэнні яго ў план 1935 і 1936 гг.

Складаючы праекты, шкоднікі наўмысна не ўлічвалі будаўніцтва гаспадарчых аб'ектаў (ледніка, погрэбаў, сараеў для дроў, каналізацыю, водаправод), без якіх эксплаатацыя гэтых будынкаў немагчыма.

Характэрна, што ў пагранічнай зоне і ў новых раённых цэнтрах Наркомаховы здароўя заніжаў размеры асігнавання на ахову здароўя. Так было ў планаванні сеткі будаўніцтва ў 1936—1937 годзе. Гэта рабілася Бурачаўскім у поўнай згодзе з шкоднікамі з Соўнаркома і Дзяржплана БССР, якія яго ў гэтым заўсёды ахвотна падтрымлівалі.

Прыведзеныя факты сведчаць, што ў Наркомаховы здароўя БССР мае месца прамое шкодніцтва. Аб гэтым гаворыць таксама бесліч сігналаў і скарг працоўных на бяздушныя адносіны да хворых у многіх больніцах, амбулаторыях, радзільных дамах, гарадскіх і раённых аддзелах аховы здароўя і, нарэшце, у самім наркамаце. Аб адным абураючым факце мы хочам тут расказаць.

Ужо каля двух год Наркомаховы здароўя здзекваецца над былой чырвонай партызанкай, актыўнай удзельніцай грамадзянскай вайны, жонкай камандзіра Чырвонай Арміі тав. Новікавай-Кудзінай, у якой двое дзяцей хварэюць на вочы. Кожны раз, калі яна прыходзіла ў Наркомаховы здароўя і дабівалася пасылкі дзяцей на лячэнне ў санаторый, Бурачаўскі, двурушнічаючы, накладаў на яе заявы рэзалюцыі аб аказанні дапамогі, але кожны раз загалчык сектара аздараўлення дзяцей і падрострку Камянецкая, з ведама-ж Бурачаўскага, адмаўляла гэтым рэзалюцыі і адмаўляла Новікавай-Кудзінай у дапамозе.

З вялікімі пяжкасцямі зморанай і разбітай маці ўдалося паміма Наркомаховы здароўя накіраваць дзяцей у санаторый. Але калі аб гэтым даведалася Камянецкая, яна распаразідзілася выпісаць іх. У апошнія дні перад выпіскай дзеці ляжалі цяжка хворымі, з высокай тэмпературай, але і гэта не спыніла Камянецкую. Іх выпісалі і адправілі дамоў. З таго часу Камянецкая паперакор усім шматлікім даведкам урачоў і прафесараў імкнецца рознымі махінацыямі даказаць, што дзеці Новікавай-Кудзінай не маюць патрэбы ў санаторным лячэнні. Яна рашыла ва што-б та ні стала адпомсціць маці хворых дзяцей за празмерную «назойлівасць».

Пара ачысціць апарат наркамата ад двурушнікаў, робячых выгляд, што яны клапоцяцца аб здароўі працоўных, а на самой справе здзекваюцца над імі, шкодзяць здароўю працоўных.

С. ГАЛКІН.



Днямі «Звязда» паведамляла аб выдатных рэкордах па ўборцы ільну знатнага ільнацерабільшчыка Будакашалеўскай МТС тав. Дзімітрыя Афанасенкі і трактарыста Васілія Галіцкага. 19 ліпеня яны выцерабілі за змену 15,07 гектара ільну. НА ЗДЫМКУ: тт. Афанасенка і Галіцкі за церабленнем ільну на палях калгаса «Орка». Фото С. Грына.

ЗА ПЯРШЫНСТВА Ў РЭСПУБЛІЦЫ

Рэзва і праворліва бяжыць і ўядаецца ў густую ільняную сцяну ільнацерабілка. Следам за ёй бясконцай зеленаватай лентай сцелецца выцераблены лён. З кожным кругам усё меншым і меншым становіцца ўчастак.

На ільнацерабілцы жвава завіхаецца комсамолец Дзмітрый Васільевіч Афанасенка. Гэта ён з трактарыстам Васілём Галіцкім за 15 гадзін работы 19 ліпеня выцерабіў 15,7 гектара ільну. У гэты дзень Афанасенка зарабіў 165 руб., а трактарыст Галіцкі 132 руб. Уся ўвага Дзмітрыя зараз сканцэнтравана на машыне. Ён умела адной рукой рэгулюе яе ход, другой дапамагае бесперабойнай рабоце транспарцёра слаць роўную ільняную ленту.

Афанасенка цвёрда рашыў даць у гэтым сезоне не менш 170 гектараў на сваю ільнацерабілку «ВНІІЛ-5», перакрыць урадавую норму больш чым у 3 разы.

— Задача поўнасцю ажыццявімая, — гаворыць Афанасенка. — У мінулым годзе я выцерабіў 103,44 гектара ільну. Сярод ільнацерабільшчыкаў БССР я заняў чацвертае месца. Сёлета я цвёрда рашыў змагацца за першынства ў рэспубліцы на права ўдзельнічаць ва ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.

Дзмітрый расказвае пра вопыт сваёй работы, пра «сакрэты», калі іх можна так назваць, сваіх поспехаў. Яны нескладаныя і зводзяцца да аднаго—умець забяспечваць бесперабойны ход ільнацерабілкі і трактара. Трактарыст і ільнацерабільшчык павінны працаваць дружна і ўзгоднена.

Больш канкрэтна дэталізуючы свой уход за машынай, Афанасенка расказвае:

— Каб ільнацерабілка працавала бесперабойна, я своечасова і як мага лепш ачышчаю перабільныя ролікі, ачышчаю перабільныя пасы, правільна іх рэгулюю, каб яны не былі запіснуты. Дасканала сачу за мацаваннем усёй машыны і асабліва рамы, для чаго раблю своечасовую зацяжку балтоў. Кожную змену тавочу палявое кола, каб яно не заядала, і машына была лёгкай на ходу. Правільна рэгулюю рамні галаўнога транспарцёра, каб яны заўсёды былі адноўкава нацягнуты.

Каб правільна паступаў лён у машыну, паміж дзяліцелямі раблю заўсёды дакладна адноўкавую адлегласць. Асаблівы ўход раблю галоўнай каробцы трансмісіі, а таксама і астатнім каробкам, каб не так хутка зношваліся шасцёркі. Усе гэтыя работы я стараюся праводзіць ноччу ці ў дажджлівае надвор'е, калі немагчыма працаваць на полі.

Але гэтым «сакрэты» поспехаў Афанасенкі не вычэрпваюцца. Дзмітрый апрача перабільшчыка яшчэ і трактарыст. Большасць участкаў ільну, якія ён зараз убірае, яму самому прыходзілася апрацоўваць пад сяўбу. Перабленне ён правозіць на сваім трактары, які да пачатку ўборкі добраякасна адрамантаваў. Да пачатку ўборкі ён абыхоліў і добра вывучыў усе свае ўчасткі, намеціў маршрут, па якім павінна перавозіцца ільноцерабілка з аднаго калгаса ў другі.

Але ў рабоце Афанасенкі сустрэлася адна ад яго незалежачая перашкода. Будакашалеўскі раён не ільнаводчы. Участкаў вялікіх ільну тут няма і, каб выцерабіць 170 гектараў, трэба аб'ехаць больш 10 калгасаў раёна. Афанасенка і з гэтай цяжкасці знайшоў выхад. Машыну ён перавозіць ноччу.

Трактарыст Васіль Галіцкі з такой-жа любоўю і клопатамі сочыць і даглядае за трактарам. За час уборкі 34 гектараў ільну ён зэканоміў 227 кілограмаў гаручага. Усё гэта дае поўнае права гаварыць Афанасенку, што 8—10 гектараў ільну можна лёгка выцерабіць на ільнацерабілцы «ВНІІЛ-5» нават у такім раёне, як Будакашалеўскі, дзе ўчасткі ільну невялікія і многа часу траціцца на пераезды.

Якасць перабленння ільну ў Афанасенкі таксама нядрэнная. Вось адзін характэрны эпізод, які красамоўна гаворыць за гэта. У мінулым годзе ў калгасе імя Сталіна, Патапаўскага сельсавета, калгаснікі асталіся незадаволенымі работай ільнацерабільшчыка Жураўлёва. І калі Афанасенка сёлета прыехаў у гэты калгас, яго сустрэлі нявесліва. Але варта было яму папрацаваць некалькі гадзін і на справе паказаць добраякаснае перабленне машынай, як адносіны да яго калгаснікаў адразу-ж змяніліся.

Н. ВІШНЕЎСКІ.

ПА СЛЯДАХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ „ЗВЯЗДЫ"

„ЧАМУ СПЫНІЛІСЯ НА ГЭТЫМ"

Партыйны камітэт і прэзідыум Акадэміі навук БССР паведамляюць, што факты, указаныя ў артыкуле «Звязды» — «Чаму спыніліся на гэтым», расследуюцца створанай парткомам і прэзідыумам Акадэміі спецыяльнай камісіяй. Пасля скончэння работы гэтай камісіі аб яе вывадах і рашэннях будзе паведамлена рэдакцыі «Звязды».

Сакратар парткома Акадэміі навук БССР ІВАНІШЧАНКА.
За прэзідэнта Акадэміі навук БССР ПАНКЕВІЧ.

ЗАБЫЛІСЯ АБ ПРЫЁМЕ У ПАРТЫЮ

Партыйная арганізацыя фабрыкі імя Кірава самая буйная ў Барысаўскім раёне. У яе радах налічваецца 96 членаў, 30 кандыдатаў і 36 спачуваючых. Сама фабрыка — старэйшая ў Беларусі. Тут ёсць выдатны кадр старых кваліфікаваных рабочых. З агульнага ліку ў 2.000 чалавек 900 — стаханаўцы. Ёсць суцэльныя стаханаўскія цэхі, змены (карабковыя, зымальны і іншыя). Комсамольская арганізацыя налічвае ў сваіх радах 185 членаў.

Усё гэта абавязвае партыйную арганізацыю арганізаваць палітыка-выхаваўчую работу для падрыхтоўкі ўзвага прыёму ў партыю. Але, на вялікі жаль, тут прыёмам у партыю не займаюцца.

З дня апублікавання пастановы ЦК партыі аб аднаўленні прыёму новых членаў у ВКП(б) прайшло больш 10 месяцаў. За увесь гэты перыяд партарганізацыя фабрыкі прыняла кандыдатам у члены ВКП(б) усяго толькі аднаго чалавека—спачуваючага т. Клёнскага і перавяла ў члены партыі з кандыдатаў т. Казак. Гэтых таварышоў, прынятых партыйнай арганізацыяй фабрыкі яшчэ ў сакавіку, райком да гэтага часу не аформіў. Спачатку тормазам гэтага з'явіліся легкадумныя адносіны сакратара парткома тав. Блінкова да афармлення дакументаў (адсутнасць у выпісках з пратакола прозвішч паручыцеляў, прысутнічаючых на партсходах і інш.). Але і зараз, калі гэтыя недахопы ўжо зжыты, райком партыі ўсё яшчэ марыцца афармленне прыёму.

Падаў заяву аб прыёме ў партыю яшчэ адзін таварыш — стаханаўка Быкоўская, пераведзеная ў часе чысткі партыі з кандыдатаў у спачуваючыя. Сакратар парткома прыняў ад яе заяву і абмежаваўся тым, што параіў ёй знайсці паручыцеляў. Такім чынам атрымліваецца, што на сёння ні адзін таварыш у партыю яшчэ не прынят.

Уся работа з кандыдатамі партыі абмяжоўваецца фармальным ахопам іх палітвучобай. Да-рэчы, многія таварышы не наведваюць заняткаў. Кандыдат партыі Левіна з 22 заняткаў прапусціла 15. Многа прапускоў мае кандыдат т. Шорнікава і іншыя.

Слаба праводзіцца работа з спачуваючымі. Адкрытыя партыйныя сходы, у якіх маглі-б прыняць удзел і спачуваючыя, — тут рэдкая з'ява.

Партыйны камітэт слаба звязан з комуністамі, не праводзіць работы з кожным таварышом паасобку. Чаго, напрыклад, варты той факт, што толькі зараз, у сувязі з падачай заявы кандыдатам партыі тав. Парфенюк, партком выпадкова даведваецца, што гэты таварыш не з'яўляецца совецкім падданым. А яе-ж прымалі ў кандыдаты партыі яшчэ ў 1932 годзе на гэтай фабрыцы. Пільнасць, асабліва пры прыёме ў партыю, трэба строга захоўваць. Але-ж твар гэтага таварыша за такі перыяд часу можна было даўно вывучыць, калі-б партком быў добра звязан з кожным комуністам.

Тут таксама ігнаруюць рашэнне Цэнтральнага Камітэта партыі аб прыёме лепшых, падрыхтаваных комсамольцаў у рады партыі. З часу адкрыцця прыёму ў партыю не прынят ні адзін комсамолец. Камітэт комсамола праўляе паўнейшую бяздзейнасць у справе падрыхтоўкі актыва КСМ для ўступлення ў партыю. Гэтае пытанне не было завострана на нядаўна прайшоўшым справаздачна-выбарчым комсамольскім сходзе. А што-ж можа быць больш ганаровым, як уступленне ў партыю лепшых комсамольцаў, праверaных, адданых справе партыі Леніна—Сталіна? А такія таварышы ў комсамольскай арганізацыі фабрыкі ёсць.

Партыйны камітэт проста забыў на тое, што комсамол з'яўляецца рэзервам партыі. Замест таго, каб дапамагчы комсамольскай арганізацыі ідэйна ўзброіць комсамольцаў, паладзіць работу па прыёму лепшай часткі ў рады партыі, партыйны камітэт адмахнуўся ад гэтай важнейшай справы.

Такое становішча з прыёмам у партыю ў самай буйнай партыйнай арганізацыі гаворыць аб тым, што гэты важнейшы ўчастак партработы райком прадаставіў самацёку.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ, Вл. МАЧАЛЬСКІ.

ВАРОЖАЯ РУКА У НАСЕНТРЭСЦЕ

Беларускі насеннаводчы трэст яднае 13 соўгасаў рэспублікі. Гэтыя соўгасы павінны былі з'явіцца адной з важнейшых крыніц забеспячэння сельскай гаспадаркі высокагатунковым насеннем зернавых культур.

З гэтай задачай трэст не справіўся. Хаця ў адрозненне ад іншых гаспадарак соўгасы сеюць насеннем выключна высокай кандыцыі, ураджай знімаецца ніжэй сярэдняга ўраджаю калгасаў рэспублікі. Напрыклад, у 1935 годзе сярэдні збор насення жыта гатунку «вятка» ледзь дасягаў па соўгасах трэста 7,8 цэнтнера з гектара, у 1936 годзе—8,12 цэнтнера. Ураджай азімай пшаніцы не перавышае 8,3 цэнтнера і яравой пшаніцы—7,5 цэнтнера.

Яшчэ больш ніякі ўраджай аўса гатунку «Лігова II», якога атрымана ў 1936 годзе толькі 3,7 цэнтнера з гектара. Яравая пшаніца «цэзіум» дала не больш 4 цэнтнераў, азімая пшаніца «маскоўская-2453»—2,6 цэнтнера. У асобных соўгасах ураджай куды ніжэйшы.

Усе соўгасы сістэмы Насентрэста скончылі 1936 гаспадарчы год з выключна дрэннымі паказальнікамі. Страты па ўсяму трэсту складаюць за мінулы год 3.267 тысяч рублёў. У вялікім прарыве апынуліся многія соўгасы і ў бягучым годзе.

У чым прычыны такога ганебнага правалу ўраджайнасці? Алказныя работнікі трэста—выконваючы абавязкі старшага агранома Калініч, аграном па зернавых Рагоўскі і інш.—імкнуцца знайсці розныя «аб'ектыўныя» прычыны. Калі верыць гэтым спецыялістам, шкодніцтва не закранула іх трэста.

Факты, аднак, гаворыць зусім аб іншым. Яны паказваюць, што вораг прыклаў сваю брудную лапу да соўгасаў сістэмы Насентрэста.

У 1936 годзе дырэктарам трэста падвізаўся стаўленік ворагаў народу — Бевзаўся, ставленік ворагаў народу — Бевзенка і Сапрыкага—вядомы па сваіх шкодніцкіх справах у бытнасць намесніка наркома земляробства Каранеўскі, які не мала нашкодзіў у трэсце і яго соўгасах.

Каранеўскі для адводу вачэй павялічыў планы па ўраджайнасці, а на справе рабіў усё для таго, каб знізіць ураджайнасць. І не дзіўна, што ў 1936 годзе, калі Каранеўскі прапаваў у трэсце, былі генебна ніякія паказальнікі па ўраджайнасці зернавых. Яго дзейнасць праводзілася ў поўнай згодзе з ворагамі народу, якія арудвалі ў Наркамземе БССР.

Да апошніх дзён галоўным аграномам і выконваючым абавязкі дырэктара трэста працаваў нейкі Гелер. Як цяпер высвятляецца, гэта чалавек з трацкісцкім мінулым. У 1926 годзе ён меў махрова-контрэволюцыйныя трацкісцкія выступленні, актыўна абараняў платформу обер-шпіёна Троцкага. У выніку палітычнай бясклопатнасці і гнілога лібералізма пярвічнай партарганізацыі Насентрэста Гелер змог быць у партыі і на кіруючай рабоце ў трэсце.

Каранеўскі, Гелер разам з выкрытымі зараз ворагамі народу ў Наркамземе падбіралі варожыя кадры і для кіруючай работы ў соўгасах трэста.

Да самых апошніх дзён дырэктарам соўгаса «Доктаравічы», Капыльскага раёна, працаваў стаўленік ворага народу Бенека—Паніматка; яго падтрымліваў Гелер, а таксама работнікі трэста Калінін і Рагоўскі. Нават і сёння Рагоўскі ўпарта абараняе Паніматка, абазываецца аб ім як аб «энергічным» гаспадарніку.

А «гаспадаранне» Паніматка ў соўгасе «Доктаравічы» звялося да насаджэння падхалімства, сямейнасці, да сістэматычнага ашуканства дзяржавы. З гэтай мэтай ён падбіраў і спойваў блізкіх да сябе людзей, якія падымалі яго «аўтарытэт», рэкламавалі яго «поспехі».

А за шуміхай аб «поспехах» хаваліся шкодніцкія справы. Паніматка ўгаварваў і прымушаў аграномаў залічваць ніякія гатункі збожжа ў больш высокія. Пагатункі збожжа ў больш высокія. Паніматка праведзена веснавая сяўба. 28 гектараў аўса было пасеяна з вялікімі агрэхамі, 40 гектараў безалкалоіднага лубіну, па сутнасці, знішчана. Лубін на ўчастку «Чыжэвічы» зусім не прыходваўся, з самай вясны быў заглушан пустазеллем.

Сяўба свядома планавалася шкодніцка. Напрыклад, на адным участку ў 40 гектараў патрэбна было пасадзіць бульбу. Сюды вывезлі гной, але перад пачаткам пасадкі Паніматка змяняе план, гной перавозіць на другі ўчастак.

За гэтае яўнае шкодніцтва ніхто не прыцягнут да адказнасці. Прыведзеныя факты вяломы Гелеру, ведае аб іх таксама аграном Рагоўскі, які быў «упаўнаважаным» ад трэста ў гэтым соўгасе.

З трэста свядома засылалі ў соўгасы розныя антысовецкія элементы. У соўгас «Цімкавічы» такім шляхам быў накіраван старшым бухгалтарам поп Крэшчаноўскі. Гэты «святы айцец» падабраў у кантору сваіх людзей: жонку паставіў сваім памочнікам, ксяндза — статыстыкам і дзяка таксама на падліковую працу.

Восенню мінулага года ў соўгасе «Цімкавічы» ўтвараецца дыверсійны акт: падпал кароўніка. У пажары гіне 72 галавы жывёлы. Гэты шкодніцкі акт распраўваюць, як «нядбайнасць» дырэктара соўгаса Варатынскага. Шкоднікі астаюцца нявыкрытымі.

У соўгасе «Дукора», Смілавіцкага раёна, і зараз працуе аграномам буйнейшы кулак з Пухавіцкага раёна Шырко, які меў раней каля 50 гектараў зямлі, 10 кароў і т. д.

Засмечанасць кулацкімі элементамі ёсць у многіх іншых соўгасах Насентрэста.

Самыя наглыя шкодніцкія акты ў трэсце кваліфікуюцца як «нядбайнасць». У соўгасе «Шыпяны», Смалявіцкага раёна, увесну было засеяна па-шкодніцку на плошчы ў 21 гектар гатункованага гароху, 12 гектараў ячменю. Насенне не ўзышло, загінула. Вінаўніка гэтага шкодніцтва агранома Шавелька знялі з работы за нядбайнасць(?)

Такая апека шкоднікаў дае магчымасць апошнім беспакарана праводзіць сваю гнусную работу па падрыву ўраджайнасці. В'яўнікі раскрадання і псавання дзяржаўнага дабра астаюцца беспакаранымі.

У соўгасе імя Леніна, Горацкага раёна, вясной расцягнулі амаль усе кармы, жывёла стаяла галоднай. Тыя людзі, якія раскрадалі кармы, адкрыта прадавалі іх... соўгасу. Асобныя «рабочыя» прадалі соўгасу сена на суму 1.500 рублёў.

У ліквідаваным соўгасе «Чачэвічы», Быхаўскага раёна, згніло бульбы на суму (па сабекошту) 23.000 рублёў, а ўсяго соўгас за 1936 год меў страт на 512 тысяч рублёў. Да-рэчы, праведзеная згодна рашэння ўрада ліквідацыя некаторых соўгасаў прайшла злачынна дрэнна. Многа дзяржаўнага дабра расцягнута, бо ніякага кантролю не было.

Насенная справа ў трэсце свядома заблытана. Прадукцыя соўгасаў Насентрэста праз Дзяржсортфонд пападае ў калгасы ў якасці гатункованага насення. У якія калгасы папала гэта насенне, як яно асвойваецца? У трэсце такім пытаннем ўпарта не цікавіліся і не цікавяцца. Работнікі трэста зноў ахвотна тлумачаць, што «гэта наша халатнасць».

На самой-жа справе блытаніна і абяглічка з насенным матэрыялам мае больш глыбокія карэнні. Вядома, напрыклад, што ў многіх раёнах азімая пшаніца з года на год прападае. Алкуль засылаюць непрыгодны сорт—калгасы не ведаюць. Пры такой практыцы шкодніцкія элементы лёгка маскіруюць сваю варожую дзейнасць, хаваюць канцы.

У 1934 годзе нейкім чынам у соўгасы трэста заслалі азімую пшаніцу пад назвай «норд-ост-земляні». Пшаніца дастаўлена з Усходняй Прусіі. Пшаніцу пасеялі і атрымалі ўраджай ад 1 да 2 цэнтнераў з гектара. Дзяржава панесла вялікія страты. Але, па думцы «вучоных» з Насентрэста, патрабавалася паўтарыць «вопыт» з непрыгоднай пшаніцай. У 1935 г. зноў-жа пшаніца прапала. Да-рэчы, падобныя «вопыты», якія толькі кампраметуюць соўгасы, сталі сістэмай. З года на год сеюць і такія гатункі жыта, пшаніцы, якія даюць ураджай не больш 2—3 цэнтнераў з гектара.

Не дзіўна, што за ўсе гады свайго існавання ніводнага пытання па паляпшэнню соўгаснай вытворчасці трэст не падняў. Севазваротаў дагатуль няма, аграхімічныя карты не складзены ні ў адным соўгасе, няма цвёрдага напрамку ў развіцці кожнага соўгаса ў галіне насенняводства. У многіх соўгасах засяваецца ў год да 20 розных культур. Агратэхнічныя планы і мерапрыемствы складаюцца без кантролю.

Тут культывуецца ашуканства ў складанні вытворча-фінансавых планаў соўгасаў. Гэтыя планы ў соўгасах не складаюцца і не абмяркоўваюцца. Яны складаюцца ў трэсце і без уліку магчымасцей соўгасаў, а работнікі трэста за гэта атрымліваюць ад дырэктароў соўгасаў «узнагароды». Так, напрыклад, 700 рублёў Паніматка запланіў работнікам трэста за тое, што яны тут-жа ў Менску склалі «вытворча-фінансавы план» для соўгаса «Доктаравічы».

Падрыўная работа ворага, такім чынам, нанесла немалую шкоду сістэме Насентрэста. Тут прыклала свае брудныя рукі трацкісцка-бухарынская, нацыянал-фашысцкая зграя, якая арудвала ў сістэме Наркамзема БССР; сюды яна падбірала свае кадры. Апрача названых вышэй асоб у апараце трэста працуе многа неправерaных людзей, як, напрыклад, выключаныя ў свой час з партыі старшы заатэхнік трэста Селіванаў, выконваючы абавязкі старшага агранома Калініч.

Нярэчная партарганізацыя Насентрэста (парторг Мартэнсон) праявіла поўную бясклопатнасць і палітычную слепату да ворагаў народу. Па сутнасці партарганізацыя прыкрывала Гелера, хоць ведала аб яго антыпартыйных справах. Нават тады, калі стала вядома аб трацкісцкіх выступленнях Гелера ў 1926 годзе, партарганізацыя прыняла па справе Гелера гніла-ліберальную пастанову, пакінула яго ў радах партыі. Сталінскаму райкому КП(б)Б прышлося скасаваць гэту пастанову і выключыць Гелера з партыі.

Партыйная арганізацыя з факта засмечанасці сваіх радоў і трэста варожымі элементамі ніякіх урокаў не вынесла, не прыняла ўсіх мер, каб да канца ўскрыць усе сувязі ворагаў у сістэме трэста і па-за ім.

Вынікі шкодніцтва ў Насентрэсце не ліквідаваны. Ніхто не заняўся сур'ёзна пытаннем выкрыцця ворагаў, што заселі ў гэтай сістэме, не разблытан клубок іх злачынстваў.

Насентрэст патрабуе хутчэйшага аздараўлення.

І. ШЛЯФЕР.
А. ЛОСЬ.

ПАЛІТДЗЕНЬ НА АСІПАВІЦКІМ ВУЗЛЕ

9 ліпеня на асіпавіцкім вузле быў праведзен палітдзень па пытанню аб капіталістычным акружэнні. Палітдзень быў старанна падрыхтаван. Быў арганізаван папярэдні збор пытанняў.

Сабраныя каля 150 пытанняў характарызуюць узрослую палітычную актыўнасць мас. Яны ў асноўным пазбаўляюцца на тры групы. Аб дзеяннях фашысцкіх краін, у прыватнасці Германіі, і іх шалёнай падрыхтоўцы нападу на СССР. Аб падзеях у Іспаніі і аб дзеяннях фашысцкай агентуры — прэзраных трацкістаў-бухарынцаў.

Добрая падрыхтоўка да палітдня забяспечыла арганізаванае яго правядзенне. Чыгуначны клуб на 450 чалавек не мог умясціць у сябе ўсіх сабраўшыхся. Усе ўважліва слухалі даклядчыка. Рабочыя прасілі часцей арганізоўваць палітдні аб міжнародным становішчы.

Трэба адзначыць, што парткабінет вузла аказаўся ў старане ад гэтага важнага палітычнага мерапрыемства. Парткабінет не забяспечыў чырвоных куткі адпаведнай літаратурай з тым, каб рабочыя маглі больш знаёміцца з прадстаўчым даклядам. Не ўключылася ў гэту справу і клубная бібліятэка.

29 ліпеня ў Асіпавічах будзе праводзіцца другі вузлавы палітдзень па пытанню: «Аб каварных метадах фашысцкай контрразведкі».

А. Г.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

Згодна паведамленню іспанскага міністэрства абароны, апублікаванаму 25 ліпеня вечарам, у раёне вёскі Брунетэ (на заходнім участку цэнтральнага фронта) адбываліся лютыя баі. Падтрыманыя авіяцыяй і артылерыяй, мяцежнікі пасля ўпартага бою занялі Брунетэ. Рэспубліканцы ўмацаваліся на новых пазіцыях.

Па словах карэспандэнта агенцтва Эспань, мяцежнікі прадпрынялі адначасова дзве атакі на пазіцыі рэспубліканцаў: адну з поўдня, другую — з паўднёвага ўсходу. Наступленне мяцежнікаў было падтрымана масіраваным ударам авіяцыі, скінуўшай вялікую колькасць бомб на пазіцыі рэспубліканцаў. Калі-ж авіяцыя мяцежнікаў вымушана была ўдаліцца, праследуемая рэспубліканскімі самалётамі, у бой уступіла артылерыя мяцежнікаў, якая складаецца галоўным чынам з гармат германскай вытворчасці калібрам 155 мм. На пазіцыях рэспубліканцаў у раёне Брунетэ было выпушчана звыш 10 тысяч снарадаў. Як заяўляе карэспандэнт агенцтва Эспань, Брунетэ больш не існуе, дымяцца толькі грады развалін.

У паведамленні міністэрства абароны ўказваецца, што рэспубліканцы ўтрымлівалі пазіцыі, не гледзячы на моцную бамбардыроўку мяцежнікаў. Дзеючыя ў гэтым раёне войскі ўступілі ў сувязь з часцямі, якія недалёка знаходзяцца. У другой палове дня ў рэзультаце націску мяцежнікаў рэспубліканцы адступілі на поўнач ад Брунетэ. Рэспубліканскія войскі заказваюць мяцежнікам гераічнае супраціўленне. Мяцежнікі сканцентравалі ў раёне на поўнач ад Брунетэ значныя сілы і вялікую колькасць ваеннага снаражэння.

У раёне паміж Толеда і Талаверай адбывалася інтэнсіўная ружэйная і кулямётная перастрэлка. У ваколіцах Талаверы рэспубліканскія пазіцыі падпалі моцнай бамбардыроўцы авіяцыі праціўніка.

АРАГОНСКІ ФРОНТ

У паведамленні іспанскага міністэрства абароны ад 25 ліпеня гаворыцца, што рэспубліканская артылерыя, размешчаная каля ракі Эбро, абстрэльвала мяцежнікаў, якія знаходзіліся ў замку Вільяфранка і прымусіла іх прыпыніць фартыфікацыйныя работы.

У раёне Тэруэля мяцежнікі ўзмацнілі свае атакі. У аперацыях прымала ўдзел 20 фашысцкіх самалётаў. Рэспубліканскія войскі захавалі свае пазіцыі амаль ва ўсім раёне. 25 ліпеня рэспубліканцы змянілі ў гэтым раёне сваю лінію фронта і ўмацаваліся на больш трывалых пазіцыях.

ПАЎНОЧНЫ ФРОНТ

Рэспубліканская артылерыя ў раёне мыса Майор (каля Сантандэра) правяла бамбардыроўку крэйсера мяцежнікаў «Балеарэс», які зрабіў адказныя стрэлы, не прычыніўшы, аднак, ніякіх разбурэнняў.

ПАЎДНЁВЫ ФРОНТ

На андалузскім фронце ў сектары Пасабланка рэспубліканскія войскі энергічна адбілі атаку мяцежнікаў. Усе пазіцыі мяцежнікаў былі заняты рэспубліканцамі. Праціўнік пакінуў на полі бою 30 трупаў.



Матацыклісты рэспубліканскіх войск Іспаніі.

ДЗЕЯННІ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АВІЯЦЫІ

Іспанскае міністэрства абароны апублікавала ўчора вечарам аператыўную зводку аб дзеяннях авіяцыі за 25 ліпеня.

На цэнтральным фронце ў 7 г. 30 мін. раніцы рэспубліканская авіяцыя бамбардыравала скапленні войск мяцежнікаў на поўдзень ад Брунетэ, а таксама на паўночны захад ад Вільявісіоза дэль Одон і на поўдзень ад Лас Росас.

У 15 г. 40 мін. рэспубліканскія знішчальнікі ўступілі ў бой са знішчальнікамі мяцежнікаў. У часе бою рэспубліканцамі збіты 3 самалёты маркі «Фіят» і два скорасныя самалёты мяцежнікаў. Рэспубліканская авіяцыя страціла адзін самалёт.

На арагонскім фронце ў 13 гадзін 40 мінут рэспубліканская авіяцыя бамбардыравала акопы мяцежнікаў, размешчаныя на паўночны захад ад Каўдэтэ, і скапленні мяцежнікаў у раёне Тэруэля. Бамбардыроўцы падвергліся ваенным аб'ектам мяцежнікаў у Альбарасіне і Геа дэ Альбарасін і пазіцыі праціўніка на поўдзень ад Куэвас дэ Лос Тарыхос. На поўдзень ад Альбарасіна рэспубліканскія самалёты абстрэлялі з кулямётаў войскі мяцежнікаў. Адначасова былі падвергнуты бамбардыроўцы калоны грузавікоў мяцежнікаў на дарозе каля Альбарасіна.

У 15 гадзін 40 мінут самалёты рэспубліканцаў падвергалі ўзмоцненай бамбардыроўцы вакзал Ла Фуэнтэ дэ Сан Эстэбан, а таксама дарогу з Саламанкі.

***

Карэспандэнт агенцтва Брытыш юнайтэд прэс паведамляе з Барселоны, што ў рэзультаце ўчарашняга налёту самалётаў мяцежнікаў на Барселону забіта 65 чалавек і ранена 150. (БЕЛТА).

АГІРЭ ПРЫБЫЎ У ПАРЫЖ

ПАРЫЖ, 27 ліпеня (БЕЛТА). Як паведамляюць газеты, галава баскскага ўрада Агірэ прыбыў учора ў Парыж.

КАНФЕРЭНЦЫЯ АБ'ЯДНАНАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ КАТАЛОНІІ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 27 ліпеня (БЕЛТА). У Барселоне закрылася канферэнцыя Аб'яднанай соцыялістычнай партыі Каталоніі. Выступаўшы на канферэнцыі генеральны сакратар каталонскай арганізацыі Ўсеагульнага рабочага саюза Хозэ дэль Барыо заявіў, што Ўсеагульны рабочы саюз Каталоніі налічвае зараз 500 тыс. членаў, тады як Нацыянальная канфедэрацыя працы Каталоніі налічвае толькі 370 тыс. членаў.

Пасля заключнай прамовы генеральнага сакратара партыі Камарэра канферэнцыя аднагалосна прыняла рэзалюцыі па пытаннях павесткі дня.

ПРЫБЫЦЦЁ НОВЫХ ТРАНСПАРТАЎ ЯПОНСКІХ ВОЙСК

БЭЙПІН (б. сталіца Кітая), 27 ліпеня (БЕЛТА). Учора японскія войскі пачалі зноў прыбываць у вялікай колькасці ў Паўночны Кітай. Да поўдня з Шанхайгуаня і Тангу прыбыла 5 паязноў з пяхотай, кавалерыяй і боепрыпасамі. У Тангу японцы захвацілі ўсе прыстані і склады. За апошні дзень 26 ліпеня ў порт Тангу прыбыло 4 японскіх ваенных транспарты. У бліжэйшыя дні чакаецца прыбыццё яшчэ 20 транспартаў.

НА ПАСЯДЖЭННІ ПАДКАМІСІІ ЛОНДАНСКАГА КАМІТЭТА

ЛОНДАН, 27 ліпеня. (БЕЛТА). Пасяджэнне падкамісіі лонданскага Камітэта па неўмяшанню адкрылася ўчора заявай лорда Плімута, што ў мэтах ухілення ад працэдурных труднасцяў брытанскі ўрад склаў апытальнік, які пакрывае ўсе важнейшыя моманты прапанаванага ім 14 ліпеня плана, і просіць цяпер падкамісію зацвердзіць гэты апытальнік з мэтай рассылкі яго ўсім 27 урадам, прадстаўленым у камітэце. Апошнія павінны ў пісьмовай форме прадставіць у камітэт свае адказы на ўсе пункты апытальніка.

Неадкладна пасля Плімута слова ўзяў прадстаўнік Італіі Грандзі, які заявіў, што Італія гатова «абмяркоўваць» пытанне аб адводзе «дабраахвотнікаў» у адпаведнасці з пажаданнямі брытанскага плана. Аднак, Грандзі прызнаў брытанскі апытальнік нездавальняючым і замест яго прапанаваў свой уласны апытальнік, сфармуляваны такім чынам, што адказы пераважнай большасці членаў камітэта павінны былі-б прынцыпова прызнаць за Францо права ваюючай стараны без якіх-небудзь абавязацельстваў па выводу «дабраахвотнікаў» Італіяй і Германіяй.

Прадстаўнік Германіі Рыбентроп і дэлегат Партуталіі Монтэйра паспяшаліся падтрымаць Грандзі, а прадстаўнік Францыі Корбэн у рэзкім тоне адказаў італьянскаму дэлегату, заявіўшы, што няма ніякай патрэбы замяняць брытанскі апытальнік якім-небудзь іншым.

Прадстаўнік СССР тав. Майскі спыніўся, перш за ўсё, на заяве Грандзі аб гатоўнасці італьянскага ўрада «абмяркоўваць» пытанне аб «дабраахвотніках». Гэта дэкларацыя, сказаў тав. Майскі, роўна нічога не азначае. Пытанне аб выводзе «дабраахвотнікаў» абмяркоўваецца ў камітэце ўжо пяць месяцаў, а пакуль яшчэ ні адзін «дабраахвотнік» не пакінуў Іспаніі. Наадварот, італьянскія і германскія войскі працяжаюць прыбываць да Францо. Гаворка зараз ідзе не пра «абмеркаванне» пытання аб «дабраахвотніках», а пра фактычную эвакуацыю ўсіх іншаземцаў, якія прымаюць удзел у іспанскай вайне. У камітэце італьянскі ўрад згаджаецца «абмяркоўваць» эвакуацыю «дабраахвотнікаў», ён мабыць нават дазволіць сабе роскаш дагаварыцца ў Лондане з іншымі дзяржавамі аб неабходнасці прыступіць да такой эвакуацыі, а затым на сцэне з'явіцца генерал Франко і заявіць: «Вельмі шкадую, але я не магу дапусціць маіх «дабраахвотнікаў». І на гэтым усё будзе скончана.

Пераходзячы далей да пытання аб прадстаўленні Франко праў ваюючай стараны, тав. Майскі заявіў, што такі крок не толькі супярэчыў-бы ўсім асновам міжнароднага права, але зусім выходзіў-бы за межы кампетэнцыі камітэта. «Сапраўды,— заявіў тав. Майскі,—прадастаўленне праў ваюючай стараны генералу Франко азначала-б аднабаковае змяненне ў карысць мяцежнікаў той базы, на якой пабудавана само пагалненне аб неўмяшанні. Іншымі словамі, такі акт з'явіўся-б актам інтэрвенцыі ў карысць Франко са стараны камітэта. Аб гэтым, вядома, не можа быць і гутаркі».

Рыбентроп і Грандзі выступілі з прамовамі, накіраванымі супроць выступлення тав. Майскага, і катэгарычна заявілі, што прадастаўленне Франко праў ваюючай стараны павінна разглядацца як краевугольны камень усяго брытанскага плана.

Пасля спрэчак было вырашана зтапь у архіў брытанскую і італьянскую анкеты і паслаць 27 урадам арыгінал брытанскага плана ад 14 ліпеня з просьбай не пазней поўдня 29 ліпеня прысласць сваю думку па ўсіх яго пунктах. 30 ліпеня будзе склікана новае пасяджэнне падкамісіі для даклада аб атрыманых адказах.

(БЕЛТА).

СУД

Справа ўрача Мангейм-Хургінай

26 ліпеня ў памяшканні Дзяржаўнага Яўрэйскага тэатра ў Менску судовая калегія Вярхоўнага суда БССР пад старшынствам тав. Болдырава ў складзе членаў суда — народных засядацеляў тт. Гобермана і Спірыдонава пры ўдзеле прадстаўніка дзяржаўнага абвінавачвання гарадскога пракурора т. Гінзбурга і члена калегіі абаронцаў тав. Фрыдмана, пачала слуханне справы ўрача Мангейм-Хургінай па абвінавачанню яе ва ўтварэнні тайных абортаў. На лаве падсудных таксама знаходзяцца М. Родаў — за прымушэнне грамадзянкі Кацнельсон зрабіць аборт і К. Прохарава — за парушэнне закона аб забароне абортаў.

Зала тэатра перапоўнена рабочымі, служачымі, медыцынскімі работнікамі, студэнтамі медінстытута. Усе ўважліва слухаюць паказанні цэнтральнай фігуры працэса Мангейм-Хургінай, якая ўвесь час хлусней імкнецца заблытаць суд і ўвільнуць ад адказнасці, прабуючы абвергнуць нават свае паказанні, дадзеныя на папярэднім следстве.

На пытанне старшыні суда, што прымушала яе Мангейм-Хургіну, рабіць тайныя аборты, падсудная, апускаючы галаву, адказвае: «Я зарабляю 1.200 рублёў у месяц, а муж мой 1.500 руб. Грошай на жыццё нам хацела. Тайныя аборты я рабіла таму, што хацела выручыць сваіх блізкіх знаёмых». (У зале праносіцца гулкі смех).

Але суд устанаўлівае, што Мангейм-Хургіна рабіла аборты ў пагоні за «доўгім рублём». 16 красавіка т. г., у 11 гадзін раніцы, у сябе на кватэры яна зрабіла аборт Прохаравай. За зроблены аборт яна ад сваёй «блізкай знаёмай»—Прохаравай спачатку атрымлівае 50 рублёў, а праз некалькі дзён яшчэ 200 руб. Пасля аборту Прохарава захварэла і да гэтага моманту ляжыць у больніцы.

Падсудная Мангейм-Хургіна заяўляе суду, што аб Кацнельсон яна нічога не ведае і аборту ёй не рабіла. Але пад нацыскам пытанняў, пастаўленых ёй прадстаўніком дзяржаўнага абвінавачання т. Гінзбургам, яна вымушана была прызнаць, што не паведаміла ўрачам, якія лячылі Кацнельсон, аб няўдала зробленым «кімсьці» Кацнельсон аборце.

Аднак па паказаннях сведак — урача Царфіна, праф. Клумава і іншых — суд устанаўлівае, што Мангейм-Хургіна так зрабіла толькі таму, што яна сама зрабіла Кацнельсон аборт і баялася адказнасці за яе смерць.

Перад судом другі абвінавачваемы — М. Родаў, малады інжынер-электрык. Дзяржава патрацціла нямала сродкаў на яго вучобу, але Родаў не апраўдаў звання совецкага грамадзяніна. Гэты прайдзісвет і двурушнік прабіраецца ў кандыдаты партыі з мэтай зрабіць сабе кар'еру. Але ваўка ў авечай шкуры хутка выкрываюць. З партыі яго выключаюць, як скрыўшага гнусныя справы сваіх братоў: аднаго — асуджанага на 8 год за выдачу белапольскім бандытам совецкіх работнікаў, і другога — асуджанага на 6 год па нашумеўшай справе Белдзяржснаба.

Гэты прайдзісвет прымусіў Кацнельсон зрабіць аборт і такім чынам штурхнуў яе на смерць. Пісьмо Кацнельсон, якое знаходзіцца ў справах суда, поўнасцю выкрывае Родава, як нягодніка і распусніка, які здзекваўся над Кацнельсон, а потым і над другой грамадзянкай Н., якая таксама па яго настойванню зрабіла аборт.

Совецкі ўрач павінен быць праваднікам пастаноў партыі і ўрада аб ахове здароўя працоўных. Штогод совецкая дзяржава адпускае сотні мільёнаў рублёў на ахову здароўя насельніцтва. Пашыраецца сетка радзільных дамоў, дзіцячых ясляў і іншых лекавых устаноў. Закон аб забароне абортаў быў сустрэт усімі працоўнымі з вялікім задавальненнем.

Не адзін раз урач Мангейм-Хургіна выступала на сходах пры абмеркаванні закона аб забароне абортаў. На сходзе ў пракуратуры рэспублікі яна даказвала важнасць гэтага закона, патрабуючы прымянення самых суровых мер да асоб, займаючыхся ўтварэннем тайных абортаў. Аднак, яе словы рэзка разышліся з практыкай. Сваё ганаровае званне совецкага ўрача яна аганьбіла гнусным злачынствам.

Вось чаму злачынствы ўрача Мангейм-Хургінай, Родава і Прохаравай выклікаюць абурэнне сярод прысутных на працэсе.

І. МІН.

СОВЕЦКАЯ СПАРТЫЎНАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ ВЫЕХАЛА ЗА ГРАНІЦУ

27 ліпеня кур'ерскім поездам праз Менск за граніцу праехала дэлегацыя совецкіх спартсменаў для ўдзелу ў міжнароднай рабочай алімпіядзе ў Антверпене (Бельгія). Сярод 54 удзельнікаў—19 ордэнаносцаў, узнагароджаных за спартыўнае майстэрства. У поўным складзе выехала футбольная каманда маскоўскага таварыства «Спартак». Вароты гэтай каманды будуць абараняць лепшыя вратары Саюза Акімаў і Рыжоў. Выехалі мацнейшыя баксёры цяжкаатлеты, лёгкаатлеты, гімнасты, плаўцы.

У гутарцы з карэспандэнтам БЕЛТА прадстаўнік совецкай дэлегацыі тав. Ерастаў (старшыня Маскоўскага камітэта па справах фізкультуры і спорта) паведаміў:

«Першыя выступленні совецкіх спартсменаў у Антверпене адбудуцца 29 ліпеня. Футбалісты сустрэнуцца з мацнейшай зборнай рабочай камандай Даніі. У гэты-ж дзень пачнуцца цяжкаатлетычныя спаборніцтвы з ўдзелам совецкіх гіраві́коў. Спаборніцтвы будуць вельмі ўпартыя таму, што ў Антверпене пяршынства будуць аспрачваць мацнейшыя прадстаўнікі міжнародных рабочых спартыўных арганізацый. У Бельгіі мы прабудзем 10 дзён, пасля чаго накіруемся ў Парыж, дзе будзем выступаць у гонар міжнароднай выстаўкі. У Совецкі Саюз мы вернемся ў другой палове жніўня». (БЕЛТА).

НОВЫЯ ГАЗЕТНЫЯ КАДРЫ

Комуністычны інстытут Журналістыкі Беларусі імя Кірава 23 ліпеня выпусціў новы атрад работнікаў большэвіцкага друку, 3-гадовы курс КІЖ'а скончыла 20 чалавек. Палова выпускнікоў накіроўваецца для работы ў якасці рэдактароў раённых газет, астатнія — загадчыкамі аддзелаў гарадскіх і акруговых газет.

Усе выпускнікі паехалі на 10-дзённую экскурсію ў Маскву.

Нядаўна адбыўся выпуск магілеўскай газетнай школы. Выпушчана 52 чалавекі, якія накіраваны на работу ў якасці загадчыкаў аддзелаў, сакратароў і інструктароў раённых газет.

10 жніўня пачынаюцца прыёмныя іспыты на падрыхтоўчы і першы курсы КІЖ'а. Падана 187 заяў. Мандатная камісія дапушчана да іспытаў 137 чалавек. Падача заяў прадаўжаецца.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

СЕННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО:

Памяшканне Белдзярждрамтэатра | гастролі Маскоўскага тэатра імя МОСПС
ПРАФЕСАР МАМЛОК
Пачатак у 8 г. веч.
Білеты ў касе тэатра з 12—2 і з 5 г. веч.

Гукавы кінотэатр «Чырвоная зорка»
МАЛЕНЬКАЯ МАМА

Дзіцячы гукавы кінотэатр
ДАЧКА ПАРТЫЗАНА

Гукавы кінотэатр «Пролетарый»
КРЫЛАТЫ МАЛЯР

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал»
ЖАНІЦЬБА (па Гогалю)

Гукавы кінотэатр «Спартак»
КАМЕРА № 79 (нямы варыянт)

ДЗЯРЖЦЫРК
Парк імя Горкага
(тел. 22.725)
Гастролі
ілюзіяніста
Клео ДАРОЦІ
з яе 15 асістэнтамі-ліліпутамі.
7 — МОРЭНО — 7
веласіпедысты-фігурысты
Гаксама ўдзельнічае ўся група
Пачатак у 9 гадзін веч.
Каса з 12—2 і з 5 гадз. веч.

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 28 ЛІПЕНЯ:

8.30 — «Апошнія паведамленні». 10.30 — перадача для піянераў і школьнікаў. 16.05 — антырэлігійная літаратурная перадача. 17.00 — канцэрт. 18.30 — перадача аб выбарчым законе СССР. 19.30 — песні народаў СССР. 20.00 — даклады і выступленні. 20.15 — перадача на тэму: «Навука і рэлігія». 20.30 — канцэрт. 21.30 — перадача на яўрэйскай мове. 22.00 — канцэрт. 23.00 — «Апошнія паведамленні».

Белдзяржтэатр оперы і балета
ПАКУПАЕ:
ПІЯНІНО, РАЯЛІ і інш. музычныя інструменты.
для операнага аркестра.
З прапановамі зварачацца па адрасу:
г. Менск, вул. Урыцкага, 13/15.
тэл. № 21-834.

Выдавецтву газеты «Звязда»
ПАТРЭБНА МАШЫНІСТКА.
Звяртацца: Совецкая, 63, II паверх.

БЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ КОГІЗ'а
УВАГА АНА, школ. загвучаў і партгабінетаў
ПАСТУПІЛІ Ў ПРОДАЖ
ВА ЎСЕ МАГАЗІНЫ БЕЛАДДЗЯЛЕННЯ КОГІЗ'а ГЕАГРАФІЧНЫЯ, ГІСТАРЫЧНЫЯ І НАТУРАЛЬНЫЯ КАРТЫ, ТАБЛІЦЫ І КАРЦІНЫ ПА АСОБНЫХ ДЫСЦЫПЛІНАХ.

	ЦАНА		ЦАНА
Карты фізічныя (на палатне):			
ЕЎРОПЫ	21 р.	ПАЎН. АМЕРЫКІ (на палатне)	16 р.
АЗІІ	30 р.		
ПАЎН. АМЕРЫКІ	15 р.	ПАЎН. АМЕРЫКІ	5 р. 50 к.
ПАЎД. АМЕРЫКІ	11 р.		
ПАЎШАРЫЙ	15 р.	УСХОДНЕ-КАЗАХСКАЯ ВОБЛАСЦЬ	8 р.
УРАЛА	28 р.		
СССР (на белмоне)	22 р.	КАРТЫ НЯМЫЯ (на палатне):	
Карты палітычныя:			
СВЕТУ (на палатне)	26 р.	ЕЎРОПЫ	18 р.
АЎСТРАЛІІ	5 р.	ПАЎШАРЫЙ	12 р.
АЗІІ	8 р.		
ПАЎШАРЫЙ (на палатне)	22 р.	КАРТЫ ГІСТАРЫЧНЫЯ (на палатне):	
СССР адмін. новае дзяленне (на палатне)	22 р.	РЫМСКАЯ РЭСПУБЛІКІ	14 р.
ТАПАГРАФІЧНАЯ КАРТА вучэбная (на палатне)	6 р. 25 к.	РЫМСКАЯ ІМПЕРЫЯ	17 р.
		СТАРАЖЫТНЯЯ ГРЭЦЫЯ	17 р.

ТАБЛІЦЫ:

ОРФАГРАФІЧНЫЯ (22 табл.)	10 р.	РАЗРАЗНАЯ АЗБУКА ДЛЯ ВУЧНЯ	50 к.
ЧЫСЛОВЫЯ (10 табл.)	5 р.	МНОЖАННЕ	75 к.
«ДЗЕЯСЛОВЫ НЯМЕЦКАЙ МОВЫ» (12 табл.)	5 р.	ТАБЛІЦЫ ПА ВУСНАМУ ПАДЛІКУ	3 р. 50 к.
СІНТЭЗ АМІЯКА (4 табл.)	3 р. 25 к.	ЗОНА ТАЙГІ	4 р.
ЭЛЕКТРА-ВЫМЯРАЛЬНЫЯ ПРЫБОРЫ (3 табл.)	3 р. 50 к.	ТАБЛІЦА МЕР І ВАГ	1 р.
ЗААЛОГІЯ І ЗААНАТОМІЯ ПАЗВАНКОВЫХ (10 табл.)	17 р. 50 к.	«СВЕТ ЖЫВЕЛ», ч. I (12 карцін)	7 р. 50 к.
		ч. II (10 карцін)	6 р.
		АЛЬБОМ ВУЧЭБНЫХ ТАБЛІЦ ПА ЧАРЧЭННЮ (55 табл.)	6 р. 55 к.

ЗАКАЗЫ ДЛЯ ВЫСЫЛКІ НАЛОЖАНЫМ ПЛАЦЯЖОМ НАКІРОЎВАЙЦЕ ПА АДРАСУ: МЕНСК, СОВЕЦКАЯ, 85. МАГАЗІНУ 130. ПРАДУКЦЫІ КОГІЗ'а.

ВІЦЕБСКІ ПЕДАГАГІЧНЫ РАБФАК
абвяшчае ПРЫЁМ на першы КУРС рабфака
з адрывам і без адрыву ад вытворчасці
на 1937-38 навучальны год. У рабфак прымаюцца асобы ва ўзросце не ніжэй 17 год з агульнаадукацыйнай падрыхтоўкай у аб'ёме 7 класаў сярэдняй школы. ПРЫЕМ ЗАЯЎ ДА 15 ЖНІЎНЯ. Іспыты з 25 па 29 жніўня 1937 г. па наступных прадметах:
белмова і літаратура, руская мова і літаратура, матэматыка (алгебра, геометрыя і арыфметыка), фізіка, гісторыя, геаграфія і прыродазнаўства.
Да заявы неабходна прыкласці: пасведчанне аб сканчанні семігодкі (копіі і пасведчанні аб пераводзе ў 8 клас не прымаюцца), аўтабіяграфію, напісаную ўласнаручна, метрыку, даведку аб стане здароўя, 2 фотакарткі памеру 3х4 см. (здымкі без галаўных убораў) з уласнаручным подпісам, заверанымдзяржустановай, і на 40 кап. паштовых марак для адказу. Паспарт прад'яўляецца паступаючым асабіста.
Жадаючыя паступіць на другі і трэці курсы падвяргаюцца іспытам па ўсіх дысцыплінах за папярэдні курсы. Асобы, дапушчаныя да прыёмовых іспытаў, з'яўляюцца ў рабфак толькі па выкліку. Усе прынятыя ў рабфак з адрывам ад вытворчасці забяспечваюцца стыпендыяй і інтэрнатам. Для студэнтаў без адрыву ад вытворчасці будуць арганізаваны зменныя групы.
АДРАС: ГОР. ВІЦЕБСК, ВАЛАДАРСКАЯ, д. № 58/15.

Рагачоўскі настаўніцкі інстытут
абвяшчае ПРЫЕМ
на 1937—38 на вучальны год
на гістарычнае і літаратурна-лінгвістычнае аддзяленні.
У інстытут прымаюцца асобы ва ўзросце ад 17 да 35 год. скончыўшыя сярэднюю школу, тэхнікум, рабфак, курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ, настаўнікі пачатковых і сярэдніх школ, якія маюць 3-гадовы педстаж.
Незалежна ад адукацыі паступаючыя павінны трымаць іспыты ў аб'ёме курса сярэдняй школы па беларускай і рускай мовах і літаратуры, матэматыцы, фізіцы, хіміі і палітграмаце.
Заявы падаваць да 1 жніўня. Да заявы патрэбна прыкласці наступныя дакументы: аб асвеце, даведку аб здароўі, аўтабіяграфію і даведку аб ранейшай рабоце, дзве фотакарткі з уласнаручным подпісам, паспарт (прад'яўляецца асабіста пры паступленні).
Прыёмовыя іспыты адбудуцца з 1 па 20 жніўня, а залічэнне—з 20—25 жніўня 1937 года.
Адрас Інстытута: БССР, г. Рагачоў, вуліца Луначарскага, дом № 46/23
Настаўніцкі інстытут. ДЫРЭКЦЫЯ.

Гомельскі ўсебеларускі індустрыяльны тэхнікум будматарыялаў
абвяшчае НАБОР СТУДЭНТАЎ
на 1937—38 навучальны год на першы курс.
Тэхнікум рыхтуе тэхнікаў-тэхнолагаў керамічнай прамысловасці. У тэхнікум прымаюцца асобы ва ўзросце ад 16 да 35 год. скончыўшыя паўпоўную сярэднюю школу.
Курс навучання — 4 гады.
Заявы прымаюцца да 1 жніўня штодзенна за выключэннем агульных выхадных дзён (6, 12, 18, 24 і 30).
Да заявы прыкладаюцца: пасведчанне аб адукацыі, аўтабіяграфія, метрычны выпіс, 2 фотакарткі з уласнаручным подпісам, пасведчанне аб здароўі і паштовых марак на 40 кап.
Іспыты будуць праводзіцца з 15 па 25 жніўня 1937 года па наступных дысцыплінах: родная мова, гісторыя, матэматыцы, фізіцы і хіміі.
На іспыты з'явіцца на выклік тэхнікума.
Інтэрнат, забяспечваюцца інтэрнатам. Стыпендыя — па паспяховасці.
Адрас: Гомель, Ветраная вул. № 50 Тэхнікум будматарыялаў.
ДЫРЭКЦЫЯ.

МЕНСКАЯ 2-гадовая ШКОЛА МЕДСЯСЦЁР
абвяшчае НАБОР НА 1937—38 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД
Школа медсясцёр рыхтуе медыцынскіх сясцёр па догляду за хворымі.
У школу прымаюцца грамадзяне абодвага полу ад 15 да 35 год, якія маюць агульнаадукацыйную падрыхтоўку не ніжэй 7 класаў сярэдняй школы.
Усе паступаючыя ў школу падвяргаюцца прыёмовым іспытам па матэматыцы (арыфметыцы, алгебры, геаметрыі), фізіцы, геаграфіі, роднай мове і гісторыі.
УВАГА. Грамадзяне, якія маюць пасведчанне аб сканчэнні 7 класаў сярэдняй школы па асноўных прадметах на выдатна, а па маляванню, чарчэнню, спевам, музыцы, фізкультуры не ніжэй чым на добра, прымаюцца без іспытаў.
Прыём заяў аб залічэнні праводзіцца да 1 жніўня.
Іспыты з 15 па 20 жніўня.
Да заявы неабходна прыкласці: а) атэстат аб сканчэнні НСШ (у арыгінале), б) метрычны выпіс, в) даведку аб стане здароўя, г) 2 фотакарткі, д) на 40 кап. паштовых марак.
Слухачы забяспечваюцца стыпендыяй згодна існуючых правіл. Інтэрнатам школа не забяспечвае, але выплачвае кватэрныя.
Дакументы накіроўваць па адрасу: г. Менск, Клінічны гарадок, школа медсясцёр.
Канцылярыя адчынена ад 10 да 3 гадзін дня.
ДЫРЭКЦЫЯ ШКОЛЫ.

ПРАЦЯГ ПАСЯДЖЭННЯ ПЛЕНУМА МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА

РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ АДБУДЗЕЦЦА СЁННЯ, 28 ЛІПЕНЯ, У 7 ГАДЗ. ВЕЧАРА Ў ПАМЯШКАННІ ДОМА ПАРТАКТЫВА.

Яўка членаў і кандыдатаў горсовета абавязкова.

ПРЭЗІДЫУМ ГОРСОВЕТА.

РАСКЛАД

РАДЫЁПЕРАДАЧ ІНСТЫТУТА МАСАВАГА ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ ПАРТАКТЫВА ПРЫ ЦК КП(б)Б НА ЖНІВЕНЬ 1937 года.

ЦЫКЛ ЛЕКЦЫЙ ДЛЯ АГІТАТАРАЎ — 7, 17, 27 жніўня (па трансляцыі з Масквы).

БЯГУЧАЯ ПАЛІТЫКА ПАРТЫІ І ЎРАДА — 2, 4, 21 жніўня (па трансляцыі з Масквы).

ДЫРЭКЦЫЯ ІНСТЫТУТА.

СМІЛАВІЦКІ ПАЛЯВОДЧЫ ТЭХНІКУМ
абвяшчае НАБОР СТУДЭНТАЎ на 1 курс.
Тэхнікум рыхтуе АГРАНОМАЎ-ПАЛЯВОДАЎ сярэдняй кваліфікацыі
Тэрмін навучання 4 гады. У тэхнікум прымаюцца асобы ва ўзросце ад 15 да 30 год, якія маюць адукацыю ў аб'ёме НСШ.
Паступаючыя падвяргаюцца іспытам у аб'ёме праграм НСШ па беларускай мове і літаратуры, матэматыцы, фізіцы, фізічнай геаграфіі і палітграмаце. Асобы скончыўшыя НСШ па адзначаных прадметах на «выдатна», прымаюцца без іспытаў.
Прыём заяў да 18 жніўня. Да заявы прыкладаюцца: аўтабіяграфія, пасведчанне аб сканчэнні НСШ (абавязкова арыгінал), метрыка, даведка аб здароўі, дзве фотакарткі з уласнаручным подпісам, заверанымдзяржустановай і марак на 40 кап. Паспарт прад'яўляецца асабіста.
Прыёмныя іспыты адбудуцца з 19 па 28 жніўня. Пачатак заняткаў з 1 верасня.
Прынятыя ў тэхнікум забяспечваюцца стыпендыяй у залежнасці ад курса і паспяховасці ад 55 да 90 руб., інтэрнатам і сталовай. Пры тэхнікуме ёсць вучэбная гаспадарка.
Тэхнікум знаходзіцца ў 34 клм. ад гор. Менска. Маршрут паездкі: Менск а з Менска аўтобусам да м. Смілавічы.
Заявы з дакументамі накіроўваць па адрасу: п/а. Смілавічы, БССР, Смілавіцкаму паляводчаму тэхнікуму.
ДЫРЭКЦЫЯ ТЭХНІКУМА.

ВІЦЕБСКІ ВЕТЗААІНСТЫТУТ
абвяшчае НАБОР студэнтаў
на ВЕТЭРЫНАРНЫ І ЗААТЭХНІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТЫ, якія рыхтуюць ветэрынарных урачоў і заатэхнікаў вышэйшай кваліфікацыі
Інстытут мае 25 добра абсталяваных кафедр, рэнтгена-кабінет, фізіка-тэрапеўтычнае аддзяленне і вучэбны соўгас. Прыём праводзіцца па агульных для ўсіх ВНУ правілах.
Прыём заяў да 1 жніўня. Іспыты — з 1 па 20 жніўня.
Усе студэнты забяспечваюцца інтэрнатам і стыпендыяй па паспяховасці. Адрас: Віцебск, Ветзааінстытут.

Уп. Галаўлітбела № 1573,
Друкарня «Звязды». Менск, Совецкая, 63.
Б. К. С.